**прат. Сяргей Горбік**

# ТАЯМНІЦЫ БЕЛАРУСКАГА ГРЭКА-КАТАЛІЦКАГА ЭКЗАРХАТУ

**Львоў**
**2009**

*Праца аб невядомых старонках арганізацыі і дзейнасьці Беларускага Грэка-Каталіцкага Экзархату ў 1939 – 1942 г.г. Для шырокага кола чытачоў.*

***© БАПЦ, 2009 г.***

## *Прадмова*

*Бадай у ні воднай краіне сьвету няма столькі “белых плямаў” у гісторыі, як у беларускай. Па сёньняшні дзень абарона дысертацый, а таксама дасьледаваньні маладых навукоўцаў строга кантралююцца адміністрацыямі вучэбных устаноў. Адной з “непрываблівых і зачыненых” тэмаў зьяўляецца Беларуская грэка-каталіцкая царква. У школьных падручніках існаваньне беларускамоўнага асяродка ў царкве да гэтага часу амаль не ўзгадваецца. Асабліва гэта тычыцца пэрыяд, калі савецкая ўлада ўжо завалодала Беларусьсю. Тым не менш цікавасьць да гэтай тэмы не зьнікае. "Таямніцы беларускага грэка-каталіцкага экзархату" пад аўтарствам Горбіка Сяргея — чарговая праца на дадзеную тэматыку. Дзякуючы часу адкрываюцца новыя дакументы, крыніцы, якія ўсё больш расхіляюць занавесу таямніцы тых падзей, тых, якія ўсімі сіламі і сродкамі прабуюць схаваць і змаўчаць. Адметнасьць працы дасьледчыка ў тым, што ён прапануе больш глыбока і аб'ектыўна паглядзець на моманты стварэння і функцыянаваньня беларускага грэка-каталіцкага экзархату ў 1939—1942 гг.*

***(Н. Г.)***[1]

[1] http://www.kamunikat.org/2979.html

Аб гісторыі Беларускага грэка-каталіцкага экзархату 1939 – 1942 г.г. напісана досыць шмат, але, нягледзячы на пільную ўвагу дасьледчыкаў, застаюцца без адказу некаторыя пытаньні ў справе яго стварэньня і функцыянаваньня. Фактычна ўся інфармацыя зводзіцца да паўторваньня артыкула а. Льва Гарошка “Айцец Антон Неманцэвіч”, які быў надрукаваны яшчэ ў 1956 г.[2]

Разам з тым, час выявіў шмат новых дакумэнтаў і сьведчаньняў[3], што прымушаюць нас перагледзець некаторыя моманты стварэньня і функцыянаваньня Беларускага грэка-каталіцкага экзархату. Менавіта да іх мы мусім прыцягнуць увагу беларускага ды ўкраінскага чытача.

Агульна вядома, што Беларускі грэка-каталіцкі экзархат быў створаны на саборы япіскапаў у Львове ў кастрычніку 1939 г. Сынод адбыўся пад непасрэдным кіраўніцтвам мітрапаліта Андрэя Шэптыцкага. Першым грэка-каталіцкім экзархам Беларусі быў прызначаны “часова” япіскап Мікалай Чарнецкі.

Але амаль ніводны дасьледчык не адказвае на пытаньне: **Чаму япіскап Чарнецкі быў прызначаны менавіта “часовым экзархам” Беларусі?**

Уладыка Мікалай Чарнецкі з 1931 г. зьяўляўся апостальскім візытатарам грэка-католікоў Польшчы (апрача Галіцкае мітраполіі), неаднаразова наведваў уніяцкія прыходы ў Заходняй Беларусі і нават рукапалагаў для іх сьвятароў у Альберцінскай езуіцкай місіі ўсходняга абраду[4]. Таму, калі глядзець з пункту гледжаньня рэлігійна-царкоўнай мэтазгоднасьці, прыдомак “часовы” быў абсалютова непатрэбны.

Што праўда, быў і іншы момант – нацыянальны. Тут, улічваючы няўдалы вопыт дэнацыянальнае нэавуніі ў міжваеннай Польшчы[5], мэтазгодным было прызначэньне менавіта сьвядомага беларуса. Такім беларусам і быў а. Антоні Неманцэвіч, прызначэньне якога экзархам адбылося на наступным грэка-каталіцкім саборы, які таксама адбываўся ў Львове ў верасьні 1940 г. Але чаму на вырашэньне пытаньня з прызначэньнем а. Неманцэвіча

[2] а. Леў Гарошка. Айцец Антон Неманцэвіч. // “Божым шляхам”, № 70-75, студзень-сьнежань 1956 г.

[3] Сяргей Ёрш. Невядомыя дакумэнты Беларускага Грэка-Каталіцкага Экзархату // Наша ніва (Менск), 2001, № 29, 16 ліпеня.

[4] Да Злучэньня № 9 (21), 1933 г., верасень

[5] Станкевіч А. Хрысьціянства і беларускі народ. Спроба сынтэзы. Вільня (1940), Менск (1998), Львоў 2006. б.88

экзархам Беларусі спатрэбіўся амаль год? І япіскап Мікалай Чарнецкі, і мітрапаліт Андрэй Шэптыцкі добра ведалі а.Неманцэвіча яшчэ з канца 20-х гадоў ХХ ст.

Пэўны адказ на гэта дае расейскі дасьледчык Ул. Пятрушка ў сваёй працы "Аб спробах уніяцкага празелітызму ў Савецкім Саюзе перад Вялікай Айчыннай вайной". Поўная вэрсія гэтае працы была надрукавана "Саюзам праваслаўных грамадзян Украіны" (УПЦ МП).

Абаронцу палітычна-царкоўных інтарэсаў Маскоўскага Патрыярхату Ўл. Пятрушку відавочна далі магчымасьць папрацаваць у зачыненых архівах ФСБ РФ і менавіта там знайшліся некаторыя новыя факты.

Так, паводле дакумэнтаў МГБ, першапачаткова пасада беларускага экзарха была прапанавана архімандрыту Фабіяну Абрантовічу, які на пачатку ІІ Сусьветнай вайны доўгі час перабываў у Львове як асабісты госьць мітрапаліта А. Шэптыцкага[6], але архімандрыт Ф. Абрантовіч ад прапазыцыі ўзначаліць беларускі экзархат адмаўляецца[7].

У працягу кастрычніка 1939 – верасьня 1940 г.г. мітрапаліт Андрэй Шэптыцкі прапануе пасаду грэка-каталіцкага экзарха Беларусі каталіцкім сьвятарам: В. Гадлеўскаму; Ад. Станкевічу і П. Татарыновічу[8]. Але і гэтыя сьвятары адмаўляюцца. Сьлед нагадаць, што ўсе яны былі актыўнымі прыхільнікамі менавіта беларускай Уніяцкай Царквы і беларускай нацыянальнай дзяржаўнасьці.

Зрэшты, маюцца і надрукаваныя, яшчэ ў 1995 г., дакумэнты, у якіх сам мітрапаліт А. Шэптыцкі называе тыя ж імёны ў якасьці найбольш годных на беларускіх япіскапаў-уніятаў[9].

Нагадаем таксама, што, у выпадку згоды тагачаснага савецкага кіраўніцтва на місійна-празэлітыскую працу ва Ўсходніх раёнах СССР, мітрапаліт А. Шэптыцкі быў гатовы да супрацоўніцтва зь сталінскім рэжымам[10]. І гэта ў той час, калі беларускі і ўкраінскі нацыянальныя актывы актыўна рыхтаваліся да ўзброенага супраць-

---

[6] Церква і Церковна єдність. Документи і Матеріали 1899 – 1944. Львів, 1995. б.464.

[7] Петрушко Вл. О попытках униатского прозелитизма в Советском союзе накануне Великой отечественной войны. Киев, 2002 г. б.11.

[8] Тамсама. Але прапанова пасады экзарха кс.Татарыновічу мне падаецца сумнеўнай, магчыма аўтар зблытал яго з кс.У. Талочка.

[8] Церква і Церковна єдність. Документи і Матеріали 1899 – 1944. Львів, 1995. б.464.

[10] Torzecki R. Polacy i ukraincy. Warszhawa. 1993. б. 107.



стаяньня зь СССР у выпадку пачатку нямецка-савецкай вайны.

Пытаньне аб падставах асабістай адмовы ад прапазыцыі мітрапаліта А. Шэптыцкага кожнага зь вядомых беларускіх сьвятароў — тэма асобнага дасьледаваньня. Але некаторыя гістарычныя моманты варта ўзгадаць.

Практычна ўсе дзеячы беларускага нацыянальнага руху ад XIX ст. разглядалі Ўніяцкую Царкву як Царкву каталіцка-нацыянальную, здольную аб'яднаць беларускі народ на падмурку роднага хрысьціянскага абраду і роднай беларускай мовы. Сваё першаснае афармленьня падобная думка атрымала ў рэдакцыі Кастуся Каліноўскага[11], а потым – ідэях Івана Луцкевіча[12], Алаізы Пашкевіч (Цёткі)[13], кс. Адама Станкевіча[14] ды іншых.

Цікава, што, гаворачы аб кантактах беларускіх дзеячаў зь мітрапалітам А. Шэптыцкім на пачатку ХХ ст., практычна ўсе беларускія і ўкраінскія дасьледчыкі абмяжоўваюцца плянам стварэньня Зямельнага банку, што меўся выкупаць зямлю для беларускіх вяскоўцаў. Паміж апошнімі плянавалася пасяліць галічануніятаў (магчыма — манахаў чыну сьв. Тэадора Студыта)[15], каб яны пашыралі ідэі ўніі. Дзеля ажыцьцяўленьня гэтага пляну, мітрапаліт Андрэй Шэптыцкі таксама "возбуждал перед русским Правительством ходатайство о предоставлении Ему права приобретения в губерниях: Витебской, Минской, Могилевской и Смоленской земельных участков..."[16] А крах дамоўленасьцяў – тым, што тагачасны прэмьер Расейскай імпэрыі Сталыпін забараніў утварэнне банку[17].

Разам з тым, варта прааналізаваць тагачасны (пачатку ХХ ст.) стан уніяцкай ідэі ці ўніяцкага руху на Беларусі.

---

[11] Каліноўскі Кастусь. За нашу вольнасць. Менск, 1999 г. б.16.

[12] Центральный Государственный Исторический Аархив (ЦГИА) (г. Ленинград (С-Петербург)), ф. 821, оп. 125 дел.3310, стр. 32-35

[13] Конан Ул. Пакутнікі за веру і Бацькаўшчыну. // Беларускія рэлігійныя дзеячы ХХ стагоддзя. Жыццяпісы, мартыралогія, успаміны. Мн.-Мюн., 1999 г. б.686.

[14] Крыніца, 1921 г., 16 лютага

[15] Аб манахах чыну сьв. Тэадора Студыта мяркуецца выключна з пункту гледжаньня падпольнага характару падобнае працы і закладзенай ў статут гэтага чыну "сінадальнай абрадавасьці".

[16] ЦГИА Лен., ф. 821, оп. 125 дел.3310, стр. 32-35

[17] Митрополит Андрій Шептицький. Львів, 1995 р. б.34

# РꙋКОВОДСТВО

ВЪ

# ЦЕРКОВНЫЙ ТИПИКОНЪ,

которое

къ дꙋшеполезное ѹпотребленіе юношества

СОСТАВИЛЪ И ДОПОЛНИЛЪ:

Дръ АЛЕКСАНДРЪ МИКИТА,

каѳедральнаго Храма Мꙋкачевскаго каноникъ-хранитель.

Соизволеніемъ епархіальнаго Правительства

ВЫДАЕТЪ:

ЦЕРКОВНО-ЛИТЕРАТꙊРНЫЙ КРꙊГЪ ѸНГВАРСКАГО СѢМЕНИЩА.

ВТОРОЕ ИЗДАНІЕ.

УНГВАРЪ,
КНИГОПЕЧАТНЯ ОБЩЕСТВА СВ. ВАСИЛІЯ ВЕЛИКАГО.
1901.

*Тытульная бачына аднаго з падручнікаў па “Закону Божаму” Грэка-каталіцкае Царквы выдадзенага Базыльянамі. Менавіта яму навучаліся сэмінарысты Львова, Станіслава (Ів.Франкоўска) прад І Сусьветнай вайной. На падобнае мове вялося і навучаньня.*





День св. Апостола и Еванг. Матѳеѧ. 10. День свѧтой Мꙋченицы Екатерины. 11. День св. Апостола Андреѧ. 12. Свѧтыхъ 14 тысѧщъ Мꙋчениковъ младенцевъ отъ Ирода Христа ради ѹбіенныхъ. 13. День св. Антоніѧ великаго. 14. День св. Аѳанасіѧ и Кирилла. 15. День св. Евѳиміѧ великаго. 16. Перенесеніе мощей свѧтаго Іоанна Златоꙋстаго. 17. День св. Ѳеодора Стратилата.[1]) 18. День св. Ѳеодора Тирона.[2]) 19. Первое и второе Обрѣтеніе Ч. Главы св. Іоанна Крестителѧ. 20. День св. 40 Мꙋчениковъ. 21. День свѧт. Еванг. Марка. 22. День св. Апостола Іакова, брата св. Іоанна.[3]) 23. День св. Аѳанасіѧ.[4]) 24. День св. Іоанна Апостола и Евангелиста.[5]) 25. День св. Константина и свѧт. Елены. 26. Третое Обрѣтеніе Главы свѧт. Іоанна Крестителѧ. 27. Соборъ свѧт. 12 Апостоловъ. 28. День св. Маріи Магдалины.[6]) 29. Ѹспеніе свѧт. Анны. 30. День свѧтаго Мꙋченика Пантелеймона. 31. День св. Апостола Матѳіѧ.[7]) [8]) Но теперь дни праздниковъ хоральныхъ зависѧтъ отъ опредѣленій епархіальныхъ.

## §. 10.

### Которіи сꙋть великіи праздники?

Праздники великіи раздѣлѧютсѧ на 3 отдѣлы: α) Къ первомꙋ принадлежитъ лишь Пасха, котораѧ есть „праздниковъ праздникъ“. β) Къ второмꙋ принадлежатъ 12 праздники: Рожд. Богородицы, Введеніе, Благовѣщеніе, Ѹспеніе Пр. Дѣвы Рождество І. Хр., Срѣтеніе, Крещеніе, Преображеніе, Входъ въ Іерꙋсалимъ, Вознесеніе, Сошествіе св. Дꙋха и Воздвиженіе ч. Креста. γ) Къ третомꙋ отдѣлꙋ же принадлежатъ: Обрѣзаніе Гдне, Рождество и Ѹсѣкновеніе Іоанна Кр. и св. АА. Петра и Павла.

---

[1]) 8-го Февр. [2]) 17. Февр. [3]) 30. Апр. [4]) 2. Мая. [5]) 8. Мая. [6]) 22. Юлія. [7]) Къ симъ праздникамъ церковнымъ по опредѣленію Его Святѣйшества Льва XIII., Архіерея Вселенскаго, причислятися имѣетъ и праздникъ св. Кирилла и св. Меѳодія. Вселенскій Архіерей бо въ Буллѣ *„Grande munus“ (1880. 30. Sept.)* такъ приказуеть: *„Itaque praecipimus, ut rato die 5-o mensis Julii, quem felicis recordationis Pius IX. constituit. in Calendarium Romanae atque Universalis Ecclesiae inseratur, agaturque quotannis festum SS. Cyrilli et Methodii cum ritus duplicis minoris Officio et Missa propria, quae S. Consilium legitimis ritibus cognoscendis approbavit.* — [8]) Пренеп. Зачатіе и день св. Димитрія суть отъ бл. п. Енна Паппъ-Силадьія межи праздники декретальніи вписанны.

*Бачына таго ж выданьня*

Так, нават расейскія дасьледчыкі падцьверджываюць існаваньня таемных беларускіх уніяцкіх арганізацыяў: "Уже 1904—1905 годах существовали кружки подвижников русского католичества в Западных губерниях. Неоднажды пробовали они получить официальный статус, но безуспешно. … Успех униатов в этих (заходніх — С.Г.) губерниях был несомненный, даже малограмматные крестьяне поддерживали эти стремления."[18] Пры гэтым, гаворачы аб абрадзе, ён заўважае "… молились и совершали различные требы по древним униатским книгам, имели много обрядов чуждых Русской Православной Церкви и не почитали множество наших святых"[19]. Словы расейскага дасьледчыка першай чвэрці XX ст. ускосна падцьверджываюць і сучасныя дасьледчыкі: Ю. Лабынцаў і Л. Шчавінская, сьцьверджываючы аб выкарыстаньні ўніяцкіх Службоўнікаў на тэрыторыі Беларусі "да канца XIX, а ў некаторых закінутых кутках яшчэ і ў пачатку XX ст."[20]

Існаваньня падпольных уніяцкіх асяродкаў падцьверджываюць і сьведчаньня аб тым, што на тэрыторыі Беларусі ў 1917 г. выйшла з падпольля 69 уніяцкіх парахфій, адна з якіх знаходзілася і ў горадзе Берасьце (Брэсьце)[21].

Мелі беларусы і ўласных кандыдатаў на ўніяцкіх сьвятароў, якія мусілі ўзначаліць таемныя прыходы. "Ужо былі кандыдаты на ўніяцкіх сьвятароў, лацінскія ксяндзы Беларусы: Язэп Зэльба і Вінцэсь Герасімовіч", — сьцьверджывае кс. Адам Станкевіч, гаворачы аб перамовах беларускага актыву зь мітрапалітам А. Шэптыцкім у 1908 г.[22]

Яшчэ большую цікаўнасьць выклікае беларускі ўніяцкі малітоўнік, які быў падрыхтаваны А. Пашкевіч (Цёткай) у 1905 — 1906 г.г. Ён мусіў быць надрукаваны ў Жоўкаўскае друкарні айцоў Базыльянаў, але, па сьведчаньню праф. У. Конана, "Па нейкіх прычынах малітоўнік ня быў надрукаваны". Яшчэ ў 1922 г. "… яго рукапіс чытаў у Жолкваўскам манастыры ксёндз і беларускі

[18] Онежинъ В.П. Русские Католики. Ялта-Царьград, 1925 г. б. 57.

[19] Тамсама, б. 59

[20] Лабынцев Ю. А., Щавинская Л. Л., Некоторые обстоятельства и средства поддержания белорусско-украинской униатской литургической практики в XVII — XIX веках. // "Древняя Русь". № 2, 2000 б. 137.

[21] Цэнтральны Дзяржаўны Гістарычны Архіў Львову (ЦДГІ), ф.201, ап.46, спр. 1849, арк. 1-4.

[22] Станкевіч А. Хрысьціянства і Беларусі Народ. // Хрысьціянская думка. №1 (211), 1992. б. 54.






*Тытул Грэка-каталіцкага малітоўніка, друк якого дабраславіў мітрапаліт Андрэй Шэптыцкі ў 1905 г.*

пісьменьнік на эміграцыі Вінцук Адважны (Я. Германовіч)"[23]. Паважаны прафэсар мусіць ня ведаў, што да сярэдзіны 60-х гадоў XX ст. украінамоўнага грэка-каталіцкага малітоўніка проста не існавала[24] (беларускамоўны ўніяцкі малітоўнік пабачыў сьвет у 1946 г., амаль на 20 год раней украінскага!). Тагачасныя ўкраінскія гэка-каталікі маліліся па царкоўнаславянску[25], а адным зь найбольшых праціўнікаў украінамоўнага служэньня зьяўляўся менавіта мітрапаліт А. Шэптыцкі (аб гэтым мы яшчэ ўзгадаем крыху пазьней). Таму, на мой погляд, доля беларускамоўнага ўніяцкага малітоўніка была вырашана ад пачатку.

Падаючы супрацьдзеяньне Сталыпіна як асноўную падставу краху супрацы дзеячаў беларускага нацыянальнага адраджэньня і мітрапаліта А. Шэптыцкага, шэраг беларускіх і ўкраінскіх дасьледчыкаў забываюцца аб гісторыі ўзьнікненьня і існаваньня расейскіх "грэка-кафолікаў". Апошнія дзеялі ў Пецярбузе, сталіце

[23] Конан Ул. Пакутнікі за веру і Бацькаўшчыну. // Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б. 686.

[24] Мова ідзе аб кананічных богаслужбовых малітвах.

[25] ІЗ ГЛУБИНИ ВОЗЗВАХ. Молитвеник. Жовква, печатня оо. Василиян, 1905.



† Ст҃ый Бо́же, ст҃ый крѣ́пкїй, ст҃ый безсме́ртный, поми́луй на́съ, г҃.

Сла́ва Ѻ҆тцꙋ̀ и҆ Сы́нꙋ и҆ ст҃о́мꙋ Дꙋ́хꙋ, и҆ ны́нѣ и҆ при́снѡ и҆ во вѣ́кы вѣкѡ́въ, а҆ми́нь.

Пресвѧта́ѧ Тро́ице, поми́луй на́съ, Гд҇и, ѻ҆чи́сти грѣхи̑ на́шѧ, Влады́ко, простѝ беззако́нїѧ на́шѧ, Ст҃ы́й, посѣтѝ и҆ и҆сцѣлѝ не́мощи на́шѧ, и҆́мене твоегѡ̀ ра́ди.

Го́споди поми́луй, г҃.

Сла́ва Ѻ҆тцꙋ̀ и҆ Сы́нꙋ и҆ свѧто́мꙋ Дꙋ́хꙋ, и҆ ны́нѣ и҆ при́снѡ и҆ въ вѣ́кы вѣкѡ́въ, а҆ми́нь.

**Молитва Господня.**

Ѻ҆́тче на́шъ, и҆̀же є҆сѝ на небесѣ́хъ, да свѧти́тсѧ и҆́мѧ твоѐ, да прїи́детъ ца́рствїе твоѐ, да бꙋ́детъ во́лѧ твоѧ̀, ꙗ҆́кѡ на небесѝ и҆ на землѝ. Хлѣ́бъ на́шъ насꙋ́щный да́ждь на́мъ дне́сь; и҆ ѡ҆ста́ви на́мъ до́лги на́шѧ, ꙗ҆́кѡже и҆ мы̀ ѡ҆ставлѧ́емъ должникѡ́мъ на́шымъ, и҆ не введѝ на́съ во и҆скꙋше́нїе, но и҆зба́ви на́съ ѿ лꙋка́вагѡ, а҆ми́нь.

—※ 4

Гд҇и поми́луй, в҃і. Сла́ва: и҆ ны́нѣ:

† Прїиди́те поклони́мсѧ, Царе́ви на́шемꙋ Бо́гꙋ.

† Прїиди́те поклони́мсѧ, Хрїстꙋ̀, Царе́ви на́шемꙋ Бо́гꙋ.

† Прїиди́те поклони́мсѧ, и҆ припаде́мъ самомꙋ Го́сподꙋ, І҆исꙋ́сꙋ Хрїстꙋ Царе́ви Бо́гꙋ на́шемꙋ.

**Псалом пятьдесятий.**

Поми́луй мѧ̀, Бо́же, по ве́лицѣй ми́лости твое́й, и҆ по мно́жествꙋ щедро́тъ твои́хъ, ѻ҆чи́сти беззако́нїе моѐ.

Наипа́че ѡ҆мы́й мѧ̀ ѿ беззако́нїѧ моегѡ̀, и҆ ѿ грѣха̀ моегѡ̀ ѻ҆чи́сти мѧ̀.

Ꙗ҆́кѡ беззако́нїе моѐ а҆́зъ зна́ю: и҆ грѣ́хъ мо́й предо мно́ю є҆́сть вы́нꙋ.

Тебѣ̀ є҆ди́номꙋ согрѣши́хъ, и҆ лꙋка́вое пре́дъ тобо́ю сотвори́хъ, ꙗ҆́кѡ да ѡ҆правди́шисѧ во словесѣ́хъ твои́хъ, и҆ побѣди́ши внегда̀ сꙋди́ти тѝ.

5 ※—

*Бачыны таго ж малітоўніка 1905 г.*
*Найбольшая ўкраінізацыя – назвы малітваў і Псальмаў.*

Расейскай імпэрыі, з пачатку XX ст. ды актыўна супрацоўнічалі зь мітрапалітам А. Шэптыцкім[26].

Нягледзячы на фармальную забарону расейскіх уладаў, мітрапаліт Шэптыцкі бярэ расейцаў ва ўласную юрысдыкцыю, рукапакладае ім сьвятароў, хадтайнічае за іх у Рыме[27].

Дарэчы, адна зь найбольш актыўных дзеячак расейскіх "грэка-кафолікаў" Натальля Ўшакова зьяўлялася пляменіцай таго ж прэм'ер-міністра Расейскай Імпэрыі П. Сталыпіна. У "расейскую" групу таксама ўваходзілі: князь Беласельскі, княжны Елена Даўгарукая і Марыя Валконская ды яшчэ шэраг прадстаўнікоў вышэйшага кола Расейскае імпэрыі.

Магчыма ўжо тады пачаліся пэўны непаразуменьня паміж мітрапалітам А. Шэптыцкім і дзеячамі беларускага адражэнскага руху.

[26] У 1900 – 1920 г.г. колькасьць расейскіх грэка-кафолікаў была каля 100 чалавек.
[27] Antoine Wenger. Rome et Moscou. 1900-1950. Desclee de Brower, 1987. (эл.вар)



Прага беларусаў да адраджэньня Беларускай Уніяцкай Царквы ў выглядзе Царквы гістарычна-нацыянальнай (беларускамоўнай, з беларускай гістарычнай абрадавасьцю, архітэктурай храмаў) не ўпісваліся ў празэлітыскія пляны Львову і Рыму. Бо, у сакавіку 1908 г., мітрапаліт А. Шэптыцкі непрыхавана апісвае свае бачаньня Грэка-каталіцкае Царквы ў Расейскай імпэрыі: "Необходимо прежде всего сохранять во всей строгости обряд нашей Восточной Православно-католической Церкви так, чтобы приходящие к нам не ўсматривали ни малейшей разницы во внешнем чине наших богослужений с тем ритуалом к которому они привыкли."[28]

Тут, на маю думку, варта павярнуцца да асобаў тых рымакаталіцкіх ксяндзоў, якіх кс. Адам Станкевіч называе "кандыдатамі на ўніяцкіх сьвятароў".

Аб Язэпе Зельбе мне дадзеных знайсьці, на жаль, не судзілася. А вось аб кс. В. Герасімовічы ў манаграфіі Ю. Гарбінскага падаюцца наступныя дадзеныя: У 1911 г. арыштоўваўся ўладамі Расейскай імпэрыі "за "сэпаратызм"; удзельнік I зьезду беларускіх каталіцкіх сьвятароў у Менску, "на правах сябра ўваходзіў у Раду Беларускае Народнае Рэспублікі"; "быў асабіста знаёмы зь львоўскім грэка-каталіцкім мітрапалітам А.Р. Шэптыцкім."[29] Як бачна – кс. В. Гэрасімовіч пераканаы і непахісны беларускі патрыёт. Ці ня гэты патрыятызм быў перашкодай пры вырашэньні пытаньня ягонага пераходу на ўнію? Дарэчы, калі ў сярэдзіне 20-х гадоў мітрапаліт А.Шэптыцкі ўздымае прад Рымам нэаўнійнае пытаньня (аб чым гаворка пойдзе ніжэй), кс. Гэрасімовіч выконвае абавязкі пробаша ў Польшчы. Але пытаньня ягонага ўдзелу ў нэаўнійным рухе не ўздымаецца.

Становішча не зьмяняецца і пасьля краху Расейскай імпэрыі ў 1917 годзе. Кажучы беларускім каталіцкім сьвятарам А. Станкевічу[30] і В. Гадлеўскаму[31] прыгожыя словы, маючы на руках зварот ураду Беларускай Народнай Рэспублікі[32], мітрапаліт А. Шэптыцкі ня робіць ніводнага кроку ў дапамозе арганізацыі менавіта Беларускай Уніяцкай Царквы. Але стварае Расейскі грэка-каталіцкі экзархат пад кіраўніцтвам а. Леаніда Фёдарава ды піша ў абарону існава-

[28] ЦДГАЛ, ф.201, ап.46, спр. 1502, арк. 35-36
[29] Гарбінскі Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.48
[30] ЦДГАЛ, ф. 408, ап. 1, спр. 775, арк 1-6, арыг. рукапіс.
[31] ЦДГАЛ, ф. 408, ап. 1, спр. 775, арк 7-8, арыг. рукапіс.
[32] ЦДГАЛ, ф. 201, ап. 4б, спр. 2383а, арк 1.

ньня гэтага экзархату вялікі артыкул, у якім падае свае бачаньня Расейскай Грэка-каталіцкай Царквы: “Упомянутая русская като- лическая Церковь сохраняет те же законы, обряды и обычаи, как и русская синодальная Церковь... Это должны понять русские католики и желающие к ним присоединится.”[33].

Узьнікае зразумелае пытаньня: Ці лічыў мітрапаліт А. Шэптыцкі парады расейскім грэка-каталікам і парадамі беларускім прыхільнікам уніяцтва? Бо, паводле агульна прынятай думкі, артыкул ён пісаў для новаўтворанага Расейскага экзархату. Але гэтая думка ня цалкам справядліва. Існуе некалькі цікавых згадак аб своеасаблівай “выведцы справай”, якую ў 1917 – 1918 г.г. зьдзясьніў у Беларусі мітрапаліт А. Шэптыцкі.

Так, у 1917 г. мітрапаліт дасылае ў Беларусь уладыку Бацяна, што на працягу пэўнага часу правіў набажэнствы на беларускам Палесьсі[34], а таксама прызначае парахам Вільні а.Валянскага[35]. Цікава тое, што ня толькі сучасныя беларускія дасьледчыкі нэаўніі практычна пакідаюць гэтыя факты па-за ўвагай. Згадак аб канкрэтнай дзейнасьці а. Валянскага не судзілася знайсьці і ў беларускім нацыянальным друку Заходняй Беларусі. А вось, што піша аб працы гэтых прадстаўнікоў Львоўскага грэка-каталіцкага мітрапаліта ягоны расейкі прыхільнік: “…они несли белорусам правдивый свет истинного греко-кафоличества. Однако их деятельность не встретила понимания ни у белорусских католиков-сепаратистов, ни у православных. Первые видели в их служении только синодальный обряд и новую попытку “русофильства”, а вторые – вообще не понимали: почему на православных службах, к которым они привыкли с детства, поминается Папа.”[36]

А вось як разумеў уніяцкую справу кс. Адам Станкевіч і ягоныя аднадумцы:“Дамагацца для беларусаў беларускай мовы ў сьвятынях; увесьці выкладаньне беларускай мовы і беларусазнаўства ў праваслаўных і каталіцкіх сэмінарыях; на біскупскіх і архірэйскіх пасадах для хрысціян-беларусаў “мы бачыць павінны толькі сыноў Зямлі нашай – беларусаў.”[37]

---

[33] ЦДГАЛ, ф. 201, ап. 4в, спр. 460, арк 1-14.
[34] Митрополит Андрій Шептицький. Львів, 1995. б. 35
[35] Тамсама, б. 31
[36] Онежинъ В.П. Русские Католики. Ялта-Царьград, 1925. б.51
[37] Конан Ул. Уладзімір Конан. Каталіцкае адраджэнне ў Беларусі: Адам Станкевіч (1891-1949). Львоў, 2006. б 16.



Такім чынам, бачаньня абрадавага служэньня мітрапалітам Шэптыцкім датычыліся ня толькі Расеі, але спробы распаўсюдзіць “асабісты” варыянт грэка-каталіцтва ў Беларусі пацярпеў поўны крах. Сярод іншых, нэаўнійную канцэпцыю Львоўскага мітрапаліта ня прыняў і такі выбітны дзеяч беларускага хрысьціянскага руху як кс. Адам Станкевіч. Можа таму, улічваючы ўласна асобу мітрапаліта Шэптыцкага ў нэаўнійнам руxе, ні а. Леў Гарошка, ні іншыя беларускія каталіцкія мэмуарысты і дасьледчыкі, практычна не ўзгадваюць аб працы яп. Бацяна і а.Валянскага.

Адзінае чаго на той час дамогся беларускі актыў – выключэньня беларускіх земляў з юрысдыкцыі расейскага грэка-каталіцкага экзарха а.Леаніда Фёдарава. Але і гэтая перамога была досыць умоўнай, бо кананічная “беларуская тэрыторыя” не канкрэтызавалася. А пасьля заканчэньня маскоўска-польскай вайны юрысдыкцыя расейскага экзарха распаўсюдзілася і на Ўсходнюю Беларусь. Апошні факт некаторыя сучасныя грэка-каталіцкія дасьледчыкі (як украінскія, так і беларускія) тлумачаць як “неабходнасьць”, але ж чаму тады пад гэтую “неабходнасьць” патрапілі толькі беларускія землі? Становішча ва Ўсходняй Украіне (УССР) нічым не адрозьнівалася ад становішча ва Ўсходняе Беларусі (БССР). Цалкам магчыма, што тут вырашальным было не беларускае, а расейскае слова. Бо яшчэ ў 1917 г. расейцы выказвалі незадаволеньня выключэньням беларускіх земляў з юрысдыкцыі а.Леаніда Фёдарава: “Вычеркивание целого ряда Российских земель из юрисдикции Русского экзарха было непоправимым ударом. ... Русские православные люди, чувствующие стремление к единению, отданы на откуп латинствующим священникам-сепаратистам и навсегда будут потеряны для Русского католицизма...”[38] Празелітызм у Расеі быў дзеля Ватыкану, адпаведна і для мітрапаліта А. Шэптыцкага, значна важлівей нацыянальных інтарэсаў беларусаў.

У 1923 годзе палесьскі біскуп Генрых Пшэдзінскі зьвяртаецца да Папы Рымскага Пія XI з дакладам аб уніяцкім руху ў ягонай япархіі ды прапаноўвае заснаваць ордэнскія місіі на тых землях Польшчы, дзе мешкае большасьць беларусаў і ўкраінцаў (выключэньня складаюць землі, дзе існуе Грэка-Каталіцкая адміністрацыя зь цэнтрам у Львове). У прыватнасьці, біскуп Пшэдзінскі піша: “...толькі ордэны здольныя зрабіць вельмі шмат для

---

[38] Онежинъ В.П. Русские Католики. Ялта-Царьград, 1925. б. 49.

разьвіцьця Ўсходняга абраду"[39]. З падобнай прапановай да Апостальскай Сталіцы зьвярнуўся і мітрапаліт Андрэй Шэптыцкі. Папа пагадзіўся і даручыў гэтую місію генэралу ордэна Езуітаў – а. Уладзіміру Лядухоўскаму. Апошні даручае арганізацыю місіі а. Шарлю Буржуа, што быў знаўцам "славянскай культуры" (ён пэўны час адпраўляў для расейскай эміграцыі набажэнствы ў Парыжы). Як высьветлілася ў далейшым, ягоная "славянскасьць" найперш была "рускасьцю". Бо падставай для богаслужэньня ва Ўсходнім абрадзе робяцца.... расейскія сінадальныя Службоўнікі. Працу Ватыканскай унійнай камісіі "Pro Russia", у тым ліку і нацыянальным пытаньні, добра характарызуе апостальскі візытатар дзеля беларусаў-каталікоў замежжа а. Аляксандр Надсан "...папская камісія "Pro Russia" зь яе ідэяй "навярненьня" Расеі ня мела часу на такія дробязі, як духоўныя патрэбы беларусаў, у існаваньні якіх як асобнай нацыі яе сябры мелі паважныя сумневы. На чале Камісіі быў францускі езуіт Францішак Дэрбіны, а адным з ягоных верных паплечнікаў — генэрал марыянаў Францішак Бучыс."[40] Адзначым, у 1931 г., калі праца камісіі "Pro Russia" цалкам выявіла свой анцібеларускі (і анціўкраінскі) характар, мітрапаліт А. Шэптыцкі зьвяртаецца зь лістом аб яе фактычнай падтрымцы[41].

Цікавы і амаль ігнараваны сучаснымі грэка-каталіцкімі гісторыкамі факт: Супраць моўна-абрадавай і "наднацыянальнай" палітыкі камісіі "Pro Russia" і мітрапаліта А. Шэптыцкага выступалі і беларускія грэка-каталіцкія сьвятары.

Так, на III-й Пінскай унійнай канферэнцыі, што праходзіла з 30 жніўня па 1 верасня 1932 г. "у адным рэфераце аўтар дамагаўся назначэння 2 эпархіяльных япіскапаў усходня-славянскага абраду: аднаго для ўкраінцаў, а другога для беларусаў ... беларускаму народу робіцца крыўдна, што яшчэ няма для беларусаў-уніятаў япіскапа іх абраду і мовы"[42]. Па зьместу паведамленьня магчыма вылучыць гіпотэзу – аўтарам узгаданага рэфэрату быў сам а.Антоні Неманцэвіч.

Але пазыцыя Рыму і ўласна самога мітрапаліта А. Шэптыцкага, як у абрадава-моўным, так і нацыянальным характары нэаў-

[39] Laski Stan. ks. Jezuici a obrzadek wschodni. Oriens, 1935 r. p. 103.
[40] Надсан Аляксандар, а. Magis amica veritas // газэта Наша Ніва., 1999 г., №06
[41] ЦДГАЛ ф. 358, ап. 1, спр.18, арк. 25-42.
[42] "Да Злучэньне", часопіс. №10, 1932 г., кастрычнік. б. 3



нійнай працы заставалася нязьменай. На Львоўскім унійным зьезьдзе ў сьнежні 1936 г., найбліжэйшы паплечнік Шэптыцкага – япіскап М. Чарнецкі яшчэ раз засьведчыў адданасьць палітыцы камісіі "Pro Russia": "Апостольська Столиця не дала ніяких інструкцій у тому напрямі, щоб унійні працівники конче заховували постанови Замойського Синоду на новоунійних теренах[43]. Отже у практиці керівники Унії на цих унійних теренах придержуються синодального обряду."[44] Характэрна – на Львоўскі ўнійны зьезд не патрапіў ніводны ўніяцкі і каталіцкі сьвятар-беларус або гісторык, і толькі а.Леў Гарошка спрабаваў вельмі асьцярожнай і па сутнасьці панславянскае тэлеграмай нагадаць украінцам аб павязанасьці Берасьцейскай уніі ды мітрапаліта Вельяміна Руцкага найперш з Беларусьсю: "Прывет Зьезду ў чэсьць і памяць Мітрапаліта Вэлярміна Рутскага! Шчырыя сярдэчныя прывітаньні тым, якія адсьветваюць вялікія ідэі вялікага Мітрапаліта! Там, дзе калісь найбуйней красавала і цьвела Яго ідэя, сягодні магілы і крыжы аб ёй успамінаюць, а тыя, што ісьці за ею хочуць нібы кайданамі спутаныя безнадзейна глядзяць у цёмную будуччыну. Няхай-та сёньняшні Зьезд будзе адным з тых здарэньняў, якія прыскораць тую хвыліну, калі родныя браты і братнія славянскія народы ўпадуць сабе ў абоймы з гучным оклікам: "Няхай жыве сьвятая Вунія" св. Горошко."[45]

На мой погляд, няпрысутнасьць на ўнійнам зьезьдзе сьвядомых беларускіх сьвятароў і навукоўцаў, апанэнтаў моўна-абрадавай палітыкі мітрапаліта Шэптыцкага, цалкам заканамерна. Апошняму хапала і апанэнтаў сярод украінскага кліру. Толькі на ўзгаданай канфэрэнцыі супраць наднацыянальнага і празэлітычна-прарасейскага падыходу да абрадавасьці выступілі: айцы Раман Лободзіч[46] і Пятро Табінскі[47].

Пэўна і а.Леў Гарошка, і іншыя беларускія прыхільнікі ўнійнай ідэі, не ўяўлялі адмоўнага стаўленьня мітрапаліта А.Шэптыцкага да самой падзеі заключэньня ўніі ў 1596 г. Так, вызнаваючы безпасьпяховасьць Ліёнскай і Фларэнтыйскай уній, міт-

[43] Г.зн. Беларускіх уніяцкіх Службоўнікаў канца XVII – пачатку XVII ст.ст.
[44] Унійний зїзд у Львові. Матеріяли зібрав і упорядкував о. Володимир Кучабський. Львів, 1938. б. 245.
[45] Тамсама, б.31
[46] Тамсама, б. 78-86.
[47] Тамсама, б. 130-146; 253.

рапаліт Шэптыцкі піша аб уніі 1596 г.: “Тое ж самае патрэбна казаць і аб Берасьцейскам саборы русінаў (беларусаў і ўкраінцаў – С.Г.). Гэты сабор, які дзеля нас, украінскіх каталікоў, зрабіўся падмуркам усяго нашага царкоўнага абнаўленьня … да такой ступені ненавідзім падзеленымі ўсходнікамі, што ва ўсёй літаратуры аб справе гэтага сабора амаль немагчыма сустрэць прыхільны водгук. Нягледзячы на тое, што амаль уся герархія нашай Царквы таго часу прыняла ініцыятыву вяртаньня ў послух Рымскаму япіскапу, падзеленым (праваслаўным) удалося так супрацьпаставіць ідэі ўніі ідэю падзелу (вернасьці Сьвятаайцоўскаму праваслаўю – С.Г.), што шматлікія тысячы, па майму меркаваньню, менавіта праз гэты сабор былі згублены для ўніі”[48]

Таму ня дзіўна, што ад 1917 і да 1939 г. адзіным падцьверджаным фактам рэальнага супрацоўніцтва мітрапаліта А. Шэптыцкага і беларускага нацыянальнага актыву ёсьць навучаньня а. Л. Гарошка ў Львоўскай Багаслоўскай Акадэміі. Калі ж у 1939 г. а. А. Неманцэвіч распачынае ў Варшаве выданьня “новага беларускага пэрыёдыка “Злучэньне”, яму дапамагае не добра арганізаваная ўкраінская грэка-каталіцкая герархія пад кіраўніцтвам мітрапаліта А. Шэптыцкага, а праваслаўныя студэнты-беларусы[49].

Цікавы факт: Амаль усе сучасныя беларускія грэка-каталіцкія дасьледчыкі, прэзэнтуючы супрацу а.Антонія і праваслаўных студэнтаў-беларусаў, як узор сумоўя і талерацыі, але не даюць аналізу альбо лягічнага тлумачэньня пытаньня выбару Варшавы новым месцам выданьня. Але ж у Галічыне (Львове) дзенічала выдаўніцтва і друкарня а.а.Базыльянаў, працавала Багаслоўская грэка-каталіцкая акадэмія і г.д. Дык чаму а.Антоній не шукаў (не знайшоў?) падтрымкі беларускага ўніяцкага выданьня ў Львове? Апошняе пытаньня хутчэй рытарычнае, бо а ні Рым, а ні Львоўскі клір мітрапаліта Шэптыцкага ніколі б не падтрымаў нацыянальных прагненьняў а. Антонія Неманцэвіча ў нэаўнійнае справе.

Адносіны беларускага актыву да нэаўнійнай палітыкі Рыму, а фактычна – ідэй і мэтаду мітрапаліта А. Шэптыцкага, добра падсумаваў кс. А. Станкевіч: “Унія сярод Беларусаў у нядаўняй Польшчы ня мела свайго асобнага ўсходняга япіскапа Беларуса, а ўлада

[48] Andreas Graf Scheptychcky. Einleitung Der chnstliche Osten. Gest und Gestalt. Regensburg, 1939. б. 13
[49] Гарбінскі Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б. 343.



над уніятамі належала да япіскапаў лацінскіх (усе палякі!). Унію гэну праводзілі сярод Беларусаў часта сьвяшчэньнікі не Беларусы і не па беларуску й не ў народным беларускім духу. ... Дзеля гэтага й вынікі працы ўнійнай былі ў нас зусім нязначныя.”[50]

Пададзеная вышэй думка кс. А. Станкевіча найкаштоўная дзеля дасьледчыкаў заснаваньня і дзейнасьці Беларускага грэка-каталіцкага экзархату, бо яна прагучала як раз у часе яго ўтварэньня.

Такім чына, абапіраючыся на існуючыя дакумэнты і факты, магчыма з упэўненасьцю сьцьвярджаць, што менавіта разыходжаньне рэлігійна-нацыянальных поглядаў дзеячаў беларускага адраджэньня пачатку XX ст. і мітрапаліта А. Шэптыцкага адкінула пачатак арганізаванага аднаўленьня беларускага ўніяцтва, бо існавалі ўсе іншыя прадумовы. А ад пачатку 20-х гадоў XX ст. беларускі каталіцкі (хутчэй за ўсё – і палітычны) актыў не разглядаў мітрапаліта А. Шэптыцкага як аднадумца і магчымага партнёра ў адраджэньні менавіта беларускага ўніяцтва. Таму адмова выбітных беларускі дзеячаў ад прапазыцыі львоўскага мітрапаліта ўзначаліць экзархат падаецца цалкам лягічнай.

Гэтую ж думку ўскосна падцьверджывае і Ўл. Пятрушка, які, абапіраючыся на паказаньні япіскапа М. Чарнецкага, дадзеныя падчас допыту ў НКГБ пасьля арышту ў 1945 г., піша: “нават Неманцэвіч запатрабаваў (ад мітрапаліта А.Шэптыцкага – С.Г.) у абмен на сваё прызначэньне “саступкі па беларусізацыі абраду”[51]. Падобныя пэўныя саступкі ён атрымаў, аб чым яскрава сьведчаць выніковыя дакумэнты сабору экзархаў у верасьні 1940 г.[52]

Відавочна, мітрапаліт Шэптыцкі рэальна ацэньваў ролю а. А. Неманцэвіча ў беларускім нацыянальным і рэлігійным руху. Менавіта таму, ужо прызначыўшы экзарха Беларусі, ён зноў зьвяртаецца да кс. А. Станкевіча з прапазыцыяй зьмяніць на гэтай пасадзе а. Неманцэвіча[53]. Але зноў атрымаў адмову, бо погляды кс. А. Станкевіча на ўніяцтва, як ужо адзначалася вышэй, аніяк не ўпісваліся ў канцэпцыю мітрапаліта А. Шэптыцкага, “Унія, трэ-

[50] Станкевіч А. Хрысьціянства і беларускі народ. Спроба сынтэзы. Вільня (1940), Менск (1998), Львоў 2006. б. 88
[51] Петрушко Вл. О попытках униатского прозелитизма в Советском союзе накануне Великой отечественной войны. Киев, 2002 г. б. 11.
[52] ЦДГАЛ, ф.201чт, ап. 1т, справа 16, аркушы 1-7.
[53] Петрушко Вл. О попытках униатского прозелитизма в Советском союзе накануне Великой отечественной войны. Киев, 2002 г. б. 17.

ба зразумець назаўсёды, павінна быць згодна з беларускім народным і палітычным адраджэньнем. Само паняцьце Уніі ўтварылася зь усіх духоўных ды нат'эканамічных патрэбаў беларуса. Унія ёсьць, казаў бы, нашай народнай верай. Унію трэба пачынаць не ад далёкіх, туманных, нікому не зразумелых спрэчак аб розніцы Веры каталікоў і праваслаўных (гэта само прыйдзе), а /з/ працы дзеля аб'яднаньня беларусаў-каталікоў і беларусаў праваслаўных у адной веры, але ў розных абрадах; пачынаць трэба ад беларускага народнага, сацыяльнага і палітычнага адраджэньня, ці лепш сказаць, пачынаць гутарку аб Уніі трэба на грунце беларускай мовы, палітыкі, гаспадаркі", – напісаў А. Станкевіч у сваём артыкуле ў гэзэце "Крыніца" яшчэ 16 лютага 1921 г.[54]

Гэтым выкрываецца таямніца "часовага" прызначэньня япіскапа М. Чарнецкага і прызначэньня а. А. Неманцэвіча экзархам Беларусі толькі ў верасьні 1940 г.

**Другая таямніца – дзейнасьць Беларускага грэка-каталіцкага экзархату на працягу 1939 – 1942 г.г.**

Пераважная большасьць беларускіх і ўкраінскіх дасьледчыкаў карыстаюцца дадзенымі справаздачы сабораў экзархаў, дзе гаворыцца: а.Антоній Неманцэвіч "зьяўляўся адзіным хто меў магчымасьць адразу карыставацца сваёй юрысдыкцыяй"[55]. Гэта значыць, робяць вынік правуніяцкія дасьледчыкі, – Беларускі грэка-каталіцкі экзархат дзейнічаў. Але ці была сапраўды гэтая "дзейнасьць"?

На час пачатку Савецка – Польскае вайны ўніяцкая справа, паводле працы беларускага гісторыка В.Пануцэвіча, выглядала наступным чынам: Віленская мітраполія – 4 парафіі, 7 сьвятароў і каля 3500 вернікаў; Пінская япархія – 12 сьвятароў і каля 7000 вернікаў; Падляшша – 10 сьвятароў, 2 дыякана і каля 5000 вернікаў[56]. Зь іх ліку – чыста беларускай зьяўлялася толькі Віленская мітраполія, а ў Пінскай і Падляшскай досыць вялікі працэнт складалі этнічныя ўкраінцы, выхадцы-перасяленцы з Галічыны. Так, згодна дасьледаваньням украінскага гісторыка Рамана Скакуна, у вёсцы Тараканы (Столінскі павет) парафія была штучна створана

[54] Конан Ул. Уладзімір Конан. Каталіцкае адраджэнне ў Беларусі: Адам Станкевіч (1891-1949). Львоў, 2006. б. 17.
[55] Хома І. Собори екзархів у Львове.// Богословія. т. XLIV VOL, Romae, 1980 р. б. 143
[56] Волаціч М. (Вацлаў Пануцэвіч). Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. // Запісы. Беларускі інстытут навукі й мастацтва. Т. 27., New York – Miensk, 2004. б. 162.



пры павернутым польскімі ўладамі каталікам былым базыльянскім храме. Пры гэтым варта заўважыць, што храм адабралі ў праваслаўных у 1921 г., а парафію здолелі стварыць, пераважна з перасяленцаў-галічанаў, толькі вясной 1926 г. Для каланістаў з Галічыны былі створаны парафіі ў Альпіні і на Марылінскіх хутарах (Столінскі павет), а таксама ў в. Гарадна, дзе менавіта перасяленцы складалі "касьцяк" парафіі[57].

Больш падрабязные дадзеныя вынікаюць зь справаздачаў ваяводскіх управаў станам на 1938 г.[58]:

| Парахфія | Павет | Год заснаваньня | Колькасьць парахфіянаў |
|---|---|---|---|
| **Беластоцкае ваяводства** | | | |
| Кросна | Бельскі | 1928 | 1000 |
| Курашова | Бельскі | 1925 | 80 |
| Фасты | Бельскі | 1925 | 1000 |
| **Віленскае ваяводства** | | | |
| Вільня | Вільня | 1928 | 122 |
| **Наваградскае ваяводства** | | | |
| Альбярцін | Слонімскі | 1925 | 600 |
| Быцень | Слонімскі | 1936 | 30 |
| Дзеляцічы | Наваградскі | 1925 | 700 |
| Сынкавічы | Слонімскі | 1926 | 300 |
| Стоўпцы | Стоўпцы | 1929 | 200 |
| **Палескае ваяводства** | | | |
| Баброві́чы | Косаў Польскі | 1926 | 1500 |
| Гародна | Столінскі | 1927 | 320 |
| Зарэчча | Пінскі | 1934 | 12 |
| Забужжа | Берасьцейскі | 1932 | 50 |
| Любішаў | Камень-Кашыр. | 1935 | 100 |
| Альпень і Марылінскія хутары | Столінскі | 1926/1931 | 1100 |
| Тараканы | Драгічынскі | 1925 | 375 |
| Угрынічы | Камень-Кашыр | 1935 | 220 |

[57] Роман Скакун. "Нова унія" у східних воєводствах Польщі (1923-1939 р.р.)// http://murasz.narod.ru/statti/neo-unija-post.htm
[58] Archiwum Akt Nowych w Warszawie, Ministerstwo wyznań religijnych i oświecenia publicznego. спр. 416, арк. 314-317

Аднак трэба ўлічваць, што пададзеныя вышэй лічбы ёсьць дадзенымі афіцыйнае польскае статыстыцы. Напраўду, колькасьць вернікаў і сьвятароў была значна меншая. Вядомы беларускі грэка-каталіцкі сьвятар, а.архімандрыт Леў Гарошка піша: "… некаторыя ўніяцкія парафіі існавалі толькі для справазданьня ў Рым. Напрыклад, у Пінскай дыецэзіі такімі парафіямі былі Курашава, Збураж, Стаўпцы."[59] Шмат праваслаўных прыходаў, патрапіўшых у афіцыйную статыстыку, пераходзілі ў грэка-каталіцтва фіктыўна каб абараніць свае царквы ад зачыненьня. Адначасна зь заявай каталіцкаму біскупу, людзі "лічылі пераход у нэавунію толькі "камэдыяй" і прасілі праваслаўнае духоўнае кіраўніцтва не надаваць гэтаму ніякага значэньня."[60]

Сьцьверджаньні а. Льва Гарошка і шэрагу праваслаўных дасьледчыкаў пераканаўча падцьверджываюць і колькасныя лічбы фактычнага цэнтру нэавунійнага руху на Тэрыторыі Заходней Беларусі – Альбярцінскай місіі а.а.Езуітаў.

Так, згодна дадзеным часопіса "Да Злучэньне", на канец 1932 – пачатак 1933 г., місія налічвала 12 сьвятароў[61] і 408 вернікаў (за 1932 г. прыядналася 50 чалавек і было ахрышчана 23 немаўля)[62]. Але ўжо ў 1939 г на службу прыходзіла каля 20 вернікаў[63]. Падобнага буйнага зьмяншэньня колькаснага складу праваслаўных альбо рыма-каталіцкіх парахфій на Слонімшчыне ў 1939 – 1944 г.г. мы не назіраем, а ў сьпісках рэпрэсаваных савецкім рэжымам[64] людзі ўсіх хрысьціянскіх веравызнаньняў прадстаўлены прыкладна ў аднолькавай колькасьці.

Слонімскі гісторык Сяргей Чыгнын слушна адзначае: "Паводле слонімскай кнігі "Памяць", да вайны і пасьля вайны рэпрэсавалі каля 300 чалавек са Слоніма, але гэтую лічбу трэба павялічыць у 10 разоў, з кожнай слонімскай вёскі забіралі на Калыму і Варкуту па 20–50 чалавек. … У полымі сталінскіх рэпрэсій загі-

[59] Айцец Леў Гарошка. Праз навальніцы й нягоды. // Адзін Госпад, адна вера, адзін хрост. Мн., 2007. б. 51

[60] Свитич А. К. Православная Церковь в Польше и ее автокефалия. Буэнос Айрес: Наша Страна, 1959. // http://www.librarium.orthodoxy.ru/svitich.htm (эл.вар.)

[61] Да Злучэньне. Часопіс. № 1 (13), 1933. б.16

[62] Тамсама, б.10

[63] ЦДГАЛ, ф. 201, ап.1, спр.16, арк.33., арыгінал, рукапіс. Некаторыя Слонімскія дасьледчыкі, у прыватнасьці С.Ёрш, сцьвярджаюць аб узбуйненьні колькасьці вернікаў Альбярцінскае парафіі пасьля прыходу немцаў.

[64] Разглядаліся дадзеныя ад верасьня 1939 па чырвень 1941 г.г.



нула шмат слонімскіх сьвятароў розных рэлігійных канфэсій. У 1937 годзе расстралялі наглядчыка Жыровіцкага духоўнага вучылішча Пятра Палянскага і настаяцеля Жыровіцкага манастыра айца Ціхана Шарапава."[65]

Дасьледаваньня шэрагу аўтараў выяўляюць, што дзеля пераважнай большасьці праваслаўных у міжваенай Польшчы "пераход" у грэка-каталіцтва быў выкліканы мерканцільнымі падставамі (выплата дзяржаўных субсыдый, паступленьня на працу альбо вучобу і г.д.). Вось як распавядае аб падобных "пераходах" вядомы праваслаўны дасьледчык А. Сьвеціч: "У нэавунію ішлі проста авантурнікі і цягнулі за сабою маральна саслабелую сялянскую масу, якая ўсьлед за падачай заявы каталіцкаму біскупу набывала добразычлівасьць паліцыі і дробных уладаў на месцах, а часам і некаторыя матэрыяльныя выгоды, бо ў такіх выпадках вярталіся адабраныя прыхадзкія землі, адчыняліся запячатаныя храмы. Пры дапамозе нэавуніі зводзіліся рахункі зь непажаданымі настаяцелямі прыходаў."[66]

Цікава, але эканамічны фактар пераходу ва ўніяцтва не прыхоўвалі і самі нэаўніяты. У кнізе "Што такое ўнія?", выдадзенай у Вільні, на карысьць уніі прыведзены наступны аргумэнт: "Вырашыў Мікола ажаніцца зь насьцяй, пайшоў да папа – давай, кажа той, 50 злотых. Юнак даваў 20, бо больш ня меў, але поп не пагодзіўся. А ўніяцкі сьвятар, пры далучэньні маладых да ўніі, павянчаў за 10 злотых. Немаўля ўдавы ўніяцкі сьвятар ахрэсьціў за 1 злоты, а не за 5, як жадаў праваслаўны, а іншую жанчыну спавядаў безкаштоўна, тады як поп за гэта жадаў узяць 50 грошаў."[67] Зь сканчэньнем дзяржаўнай падтрымкі – скончылася і "грэка-каталіцтва" гэтых людзей. Таму, па майму меркаваньню, грунтуючыся на прыкладзе слонімскай парафіі, цалкам магчыма зьменшыць афіцыйныя лічбы Польскай статыстыкі як мінімум у 5-10 разоў.

Аб досыць сьціплых выніках нэаўнійнае акцыі сьведчыць і той факт, што на ўсёй тэрыторыі Польшчы (падпадаючай пад нэаўнійную акцыю) у 1938 г. дзейнічаў толькі 51 ўніяцікі сьвятар[68].

[65] Чыгрын С. У Пошуках Слонімскіх скарбаў. Гісторыка-краязнаўчыя, журналіскія і літаратурныя нататкі. Мінск, Беларускі кнігазбор, 2006. б. 88, 90

[66] Свитич А. К. Православная Церковь в Польше и ее автокефалия. Буэнос Айрес: Наша Страна, 1959. // http://www.librarium.orthodoxy.ru/svitich.htm

[67] Што такое ўнія. Вільна, без году выданьня. б. 4

[68] Archiwum Akt Nowych w Warszawie, Ministerstwo wyznań religijnych i oświecenia publicznego. t. 416, k. 318

Грэка-каталіцкія сьвятары ў міжваенай Польшчы падпарадкоўваліся япархіяльным рыма-каталіцкім уладыкам, большая частка зь сьвятароў была рэкрутаваная з польскага рыма-каталіцкага сьвятарства (13 сьвятароў) і рускіх праваслаўных эмігрантаў (7 сьвятароў). Натуральна – падобныя сьвятары ня вельмі прыязна ўспрымалі беларусізацыю грэка-каталіцтва на Беларусі. Наогул, калі карыстацца дадзенымі польскае статыстыцы, у сакавіку 1938 г. на тэрыторыі Заходнае Беларусі дзейнічала толькі **5 (пяць)** беларускіх уніяцікіх сьвятароў. З іх ліку: У Палескім ваяводстве – 3 сьвятары-беларуса (6 – палякаў і 6 – украінцаў); Наваградскам – 1 сьвятар-беларус (4 – паляка, 1 – рускі і 1 – украінец) і Беластоцкім – 1 сьвятар-беларус.[69]

Карыстаючыся працай Ю. Гарбінскага[70], паспрабуем падлічыць менавіта сьвядомых беларускіх уніяцкіх сьвятароў на лета 1939 г., якія знаходзіліся ў межах дасягальнасьці беларускага экзарха: арх. Ф. Абрантовіч (арыштаваны савецкімі ўладамі ўжо ў 1939 г.), В. Аношка; Л. Гарошка; І. Гэрмацюк[71]; А. Дуброўскі (Дамброўскі); М. Маскалік (у Гэрманіі); К. Найловіч (на той час верагодна перабываў у Рыме); А. Неманцэвіч (экзарх); Б. Пячопка (+26.12.1940); В. Хамёнак (у Варшаве)[72]. Гэтая дадзеныя зьбягаюцца з паваеным лікам беларускага грэка-каталіцкага сьвятарства, што пададзены ў кнізе а. А.Надсана "Біскуп Чэслаў Сіповіч: сьвятар і беларус: "У 1951 годзе ў Заходняй Эўропе было шэсьць беларускіх каталіцкіх сьвятароў. Зь іх да ўсходняга (бізантыйскага) абраду належалі чатыры: Чэслаў Сіповіч у Англіі, Леў Гарошка ў Францыі, Міхась Маскалік у Паўночнай і Уладзімер Салавей у Паўднёвай Нямеччыне…"[73]

Яшчэ аднаго сьвятар, аб якім няма аніякіх ведамасьцяў, называе а. Леў Гарошка – а. Гадуцэвіч, але ў сувязі з падзеямі 1941 –

[69] Archiwum Akt Nowych w Warszawie, Ministerstwo wyznań religijnych i oświecenia publicznego. t. 416, k. 318

[70] Гарбінскі Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999.

[71] Біяграфія гэтага сьвятара і ягоныя адносіны да беларускага нацыянальнага руху застаюцца таямніцай.

[72] Харбінская ўсходняя місія а.а. Марыянаў знаходзілася па-за межамі рэальнай дасягальнасьці і таму намі не разглядаецца.

[73] http://www.chasaslovec.info/index.php?do=static&page=work_Sip_bel08



1942 г.г.[74] Як бачым – рэальных кандыдатаў – беларусаў на пераход пад юрысдыкцыю новага экзарха налічваецца няшмат.

Была яшчэ адна акалічнасьць – пераход сьвятара магчымы толькі ў юрысдыкцыю япіскапа[75], а а. Антоні ім ня быў. Не маглі сьвятары пераходзіць і пад юрысдыкцыю мітрапаліта А. Шэптыцкага, бо 23 верасьня 1940 г. ён атрымаў ліст папы Пія XII аб адхіленьні яго ад справы кіраваньня новаўтворанымі экзархатамі[76]. Толькі падчас II сабору было вырашана пытаньне з хіратоніяй а. Антонія на япіскапа. Адбылася хіратонія не раней 16 чэрвеня 1941 г., бо пратакол сабору ад гэтай даты ён падпісваў яшчэ як а. А. Неманцэвіч[77]. Першыя дакумэнты, дзе экзарх Неманцэвіч узгадваўся ў сане япіскапа, датуюцца летам 1942 г., калі экзарх-пратос М. Чарнецкі зьвяртаецца да мітрапаліта Шэптыцкага з просьбай аб скліканьні чарговага сабору экзархаў[78]. Але ад лета 1941 г. Неманцэвіч у Львове ня быў і таму хутчэй за ўсё яго хіратонія адбылася на архірэйскай літургіі раніцай 17 чэрвеня 1941 г.[79] Толькі з гэтага часу каталіцкія япіскапы маглі перадаваць у ягоную юрысдыкцыю сьвятароў усходняга абраду на тэрыторыі Беларусі. Адбылося гэта, паводле сьведчаньняў а. Льва Гарошка, не раней сакавіка 1942 г.[80] Ды гэта і не магло быць раней, бо ліст з Рыму аб зацьвярджэньні экзархату і экзархаў датаваны 22 сьнежня 1941 г., а ў Львове яго пабачылі яшчэ пазьней[81].

Зрэшты, передача адбывалася збольшага выключна на паперы. Вайна і дзьве акупацыі ўнесьлі свае карэктывы. Сам а. Леў Гарошка адзначае, што экзарх практычна ня меў у сваім падпарадкаваньні

[74] Айцец Леў Гарошка. Праз навальніцы й нягоды. // Адзін Госпад, адна вера, адзін хрост. Мн., 2007. б.53

[75] Калі экзарх ня быў япіскапам, сьвятар пераходзіў у юрысдыкцыю таго япіскапа, якому падпарадкоўваўся экзарх.

[76] ЦДГАЛ, ф. 201, ап. 1, справа 6114, аркушы 18-25.

[77] ЦДГАЛ, ф. 201, ап. 1, справа 16, аркуш 48.

[78] ЦДГАЛ, ф. 201, ап. 1т, справа 16, аркуш 133.

[79] Япіскапства а.А. Неманцэвіча да сёньня застаецца пад пытаньням. Акт Ватыкану вызнаваў толькі створеньне экзархатаў і прызначэньня экзархаў, аб вызнаньні япіскапскіх хіратоній нічога невядома. Сучасныя грэка-калікі аб япіскапстве а.Неманцэвіча афіцыйна нічога не кажуць.

[80] Гарбінскі Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.345.

[81] Письма-паслання Митрополита Андрея Шептицького, ЧСВВ. З часів німецької окупації. Йорктон, Канада, 1969 р. б.149-161.

сьвятароў[82].

Што ж тады рабіў экзарх Неманцэвіч з часу свайго прызначэньня і да сакавіка 1942 г.? Сам ён сьведчыць наступнае: "Праз цэлы час 1941 году як Экзарх Беларусі я вонкава не выступаў: пры бальшавікох гэта было небясьпечна, калі прышлі немцы і ўстанавілі ўладу, 5 сьнежня 1942 г. прдставіў я свае дакумэнты і прасіў, каб пазволілі мне прыступіць да выкананьня маёй улады. 16/III атрымаў я ад генэральнага Камісара Беларусі дакумэнт, якім прызнае сьвецкая ўлада мяне за Экзарха і дазваляе выконваць маю ўладу на Беларусі."[83]

Выяўляецца – уся дзейнасьць экзархату ад восені 1940 г. і да сакавіку 1942 г. складалася ў падрыхтоўцы стварэньня "рады экзархату" у складзе а. Вацлава Аношкі, а. Льва Гарошка і а. Івана (Яна) Гэрмацюка ды падачы адпаведнага прашэньня нямецкай уладзе ў сьнежні 1941 г.

Праўда, менскі беларускі актыў яшчэ ў жніўні — верасьні 1941 г. дамогся ад немцаў права наведваць лягеры ваеннапалоных на тэрыторыі генэральнага камісарыяту "Беларусь". Асноўнай мэтай гэтага наведваньня было рэкрутаваньне беларусаў у паліцыю і іншыя беларускія вайсковыя фармаваньні. У якасьці сяброў падобных беларускіх місіяў езьдзілі ў лягеры беларускія сьвятары розных канфэсій, у тым ліку, магчыма, і грэка-каталікі.

Ды і сам факт падачы прашэньня аб легалізацыі беларускага грэка-каталіцкага экзархату нямецкім акупацыйным уладам толькі ў сьнежні 1941 г. выклікае пытаньня, бо рыма-каталіцкая і праваслаўная Цэрквы легалізаваліся яшчэ летам[84]. Дата падачы просьбы аб легалізацыі не павязана, а ні зь лістом з Рыму (адасланым Шэптыцкаму 22 сьнежня 1941 г.), а ні зь уласным япіскапствам (чырвень 1941 г.). Значыцца былі іншыя падставы і, хутчэй за ўсё, не рэлігійнага характару.

Гартаючы біяграфіі кіруючых дзеячаў беларускага актыву ў Генэральным камісарыяце "Беларусь" у 1941 – 1942 г.г., магчыма зрабіць высновак, што толькі а. В. Гадлеўскі мог тэарэтычна

[82] а. Л. Гарошка. Айцец Антон Неманцэвіч. / Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.346.
[83] ЦДГАЛ, ф. 201, ап.1, спр.16, арк. 142 адв.
[84] Волаціч М. (Вацлаў Пануцэвіч). Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. // Запісы. Беларускі інстытут навукі й мастацтва. Т. 27., New York – Miensk, 2004. б.176-177.



сымпатызаваць ідэі адраджэньня нацыянальнай беларускай Уніяцкай Царквы. Іншыя (Р. Астроўскі, Ю. Саковіч, А. Арэхва, Я. Ермачэнка, М. Вітушка, Ус. Родзька) — былі прыхільнікамі беларускай праваслаўнай аўтакефаліі.

Паводле ўспамінаў вэтэрана беларускага супраціву Ю.В., на пачатку вясны 1942 г. ён меў сустрэчу з кс.В. Гадлеўскім. Апошні, у размове засьведчыў, што "ад верасьня 1941 г., калі ўсталявалася нямецкая і наша (беларуская – С.Г.) цывільная ўлада, а.Неманцэвіч распачаў перамовы аб падтрымцы ўнійнай справы ад пачатку зь Слонімскім, а потым і зь менскім беларускім актывам. Але ўсіх (беларускіх дзеячаў праваслаўнага і каталіцкага веравызнаньня – С.Г.), гэты праэкт не зацікавіў ні ідэалягічна, ні адміністрацыйна. Сам кс. Гадлеўскі бачыў у гэтым праэкце спробу працягу міжваенай нэаўнійнае дзейнасьці."[85] Аб адмоўным стаўленьні кс.Гадлеўскага да дзейнасьці грэка-каталіцкага экзархату сьведчыць і газэта беларускае эміграцыі "Беларуская Воля": "Ён (кс.В. Гадлеўскі – С.Г.) рашуча ставіўся супроць вуніяцкай дзейнасьці езуіта Гарошкі[86], бо гэта раз'яднала Беларусаў — настройвала праваслаўных супроць каталікоў."[87]

На мой погляд, сьведчаньне беларускага вэтэрана і паваенай эмігрантскай газэты вельмі каштоўнае. Бо, з фармальнай кропкі гледжаньня, заснаваньня Беларускага грэка-каталіцкага экзархату і прызначэньня экзархам сьвядомага беларускага сьвятара а. Антонія Неманцэвіча мусіла задавальняць каталіцкую частку беларускага актыву і знайсьці падтрымку. Таму, дзеля агульнага разуменьня нэгатыўнага стаўленьня беларускага актыву да праэкту Беларускага грэка-каталіцкага экзархату, варта больш падрабязна прааналізаваць тэзіс аб тым, што "праэкт не зацікавіў ні ідэалягічна, ні адміністрацыйна".

Сёньня шэраг дасьледчыкаў, што знаходзяцца пад грэка-каталіцкім і рыма-каталіцкім уплывам, спрабуюць абгрунтаваць нэгатыўнае стаўленьне да ўніяцтва беларускага актыву 1941 – 1945 г.г. пераважнай прыналежнасьцю да праваслаўя большасьці ягоных

[85] Ліст вэтэрана Беларускага супраціву Ю.В. аўтару ад 20 чырвеня 2008 г
[86] Тут яўная памылка аўтара. Езуітам і кіраўнікам грэка-каталіцкага руху зьяўляўся а.Неманцэвіч. Памылка, на мой погляд, вынікла ад значна больш вядомай дзейнасьці а.Гарошка ў Бэрліне (1944-1945 г.г.), а потым – у асяродках беларускіх эмігрантаў Няметчыны і Францыі.
[87] Наш адказ езуітам // Беларуская воля (Зах. Нямеччына), 1948, № 13, 17 ліпеня

дзеячаў. Але, на мой погляд, гэта далёка не так.

Хутчэй за ўсё, падобнае стаўленьне беларускага актыву да грэка-каталіцкага экзархату абумоўлена найперш не рэлігіна-канфэсійнымі, а адміністрацыйнымі ды палітычнымі падставамі; разыходжаньням беларуска-нацыянальных поглядаў на ўніяцтва з Рымам і Львовам. Бо фактычна справай уніі працягвалі кіраваць тыя ж людзі, што і ў міжваены час.

Так, экзархам-пратосам (старшынёй над экзархамі) быў прызначаны той-жа япіскап Мікола Чарнецкі, які цяпер падпарадкоўваўся (пасьля адпаведнага ліста з Рыму) мітрапаліту А. Шэптыцкаму. Апошні падпарадкоўваўся той жа камісіі “Pro Russia” і без згоды Рыму быў няздольны прымаць нейкія каардынальныя рашэньні. Япіскапства ж экзарха Антонія Неманцэвіча нідзе вольна не абвешчалася (магчыма яно не было вызнана Рымам?), а без гэтага ягоныя адміністрацыйныя і кіруючыя функцыі былі моцна абмежаны[88]. Таму беларускі актыў зрабіў лягічны высновак: унійная справа кіруецца тымі ж людзьмі і працягвае тую ж дэнацыянальную і фактчна анцібеларускую дзейнасьць.

Менавіта аб гэтай, міжваенай, гэнерацыі грэка-каталіцкага кіраўніцтва слушна напісаў Іван Касяк: “Беларусы ня толькі не кіравалі вуніяцкай акцыяй, але ня мелі ніякага нацыянальнага ўплыву на яе; вунія была пад кірауніцтвам чужых дзейнікау і зьяулялася прыладай чужацкай палітыкі.”[89] І, як вынікае, зь утварэньням Беларускага грэка-каталіцкага экзархату нічога практычна не зьменьвалася.

Калі ж у 1944 г. а. Леў Гарошка распачаў сваю дзейнасьць у Бэрліне як беларускі ўніяцкі сьвятар, але без украінскага (фактычна – і Рымскага) кіраваньня і зьвязку зь справай экзархату: “Прэзыдэнт Беларускае Цэнтральнае Рады, інтэлігенцыя, работнікі прынялі гэтую дзейнасьць весьма прыхільна.”[90] Што праўда, мне не судзілася знайсьці іншых, апрача сьведчаньняў самога а. Л. Гарошка, дакумэнтаў аб ягонай рэлігійнай дзейнасьці ў Бэрліне.

[88] Калі япіскапства экзарха А. Неманцэвіча не было зацьверджана Рымам, беларускія сьвятары фармальна знаходзідіся ў юрысдыкцыі яп. Мікалая Чарнецкага, а сам экзарх, не мог рукапакласьці новых беларускіх сьвятароў.

[89] Касяк І. 3 гісторыі Праваслаунай Царквы Беларускага народу. Нью-Йорк. 1956 г. б.57.

[90] Айцец Леў Гарошка. Праз навальніцы й нягоды. // Адзін Госпад, адна вера, адзін хрост. Мн., 2007. б.54



Такім чынам, насуперак меркаваньням шматлікіх сучасных беларускіх уніяцкіх дасьледчыкаў, беларускі нацыянальна-рэлігійны актыў канца 30-х – пачатку 40-х гадоў абсалютова не вітаў стварэньня Беларускага грэка-каталіцкага экзархату пад ідэйным кіраўніцтвам мітрапаліта А. Шэптыцкага. Гартаючы ўспаміны беларускай паваеннай эміграцыі, мы не знаходзім аніводнага прозьвішча вядомых дзеячаў беларускага руху, якія б у 1939 – 1942 г.г. рэальна падтрымаў стварэньня беларускага ўніяцкага экзархату. Толькі “Баранавіцкая газэта” і бэрлінская “Раніца” далі маленькую абвестку аб заснаваньні і легалізацыі беларускага экзархата і кароткія ведамасьці аб экзарху А. Неманцэвічу.

**Але вернемся да справы фармаваньня Рады Беларускага экзархату.**

Як ня дзіўна, само фармаваньне Рады Беларускага экзархату пакідае шэраг пытаньняў. А менавіта — як і чаму абралі якраз гэтых трох сьвятароў, як яны скантактаваліся зь экзархам. Паводле некаторых дадзеных, на восень 1940 г. і да пачатку нямецка-савецкай вайны ўсе трое працягвалі знаходзіцца на сваіх парахфіях: а. В. Аношка ў в. Дэлятычы, а. Л. Гарошка — у в. Гародна (Палесьсе) альбо ў в. “Збруж каля Маларыты”, а. І. Гэрмацюк —хутчэй за ўсё, на Наваградчыне.

Хто і як прыцягнуў іх да супрацоўніцтва? Ніводная крыніца гэтага не раскрывае. Разам з тым, разглядаючы біяграфічныя дадзеныя ўзгаданых вышэй сяброў Рады Беларускага экзархату, знаходзім шэраг цікавых момантаў.

Сьвятара В. Аношку, хутчэй за ўсё, уключылі ў Раду Беларускага экзархату па ранейшай рэкамэндацыі а. Я. Германовіча, які ад 1936 да 1938 г. кіраваў у Вільні Беларускім домам марыянаў[91] і быў добра знаёмы зь а. Аношкам[92]. Скіраваць яго да а. Неманцэвіча мог і кс. А. Станкевіч. Ва ўсіх каталіцкіх сьведчаньнях а. В. Аношку рэпрэзэнтуюць як адданага сьвятарскаму пакліканьню чалавека. Таму ня дзіўна, што менавіта яго “Экзарха назначыў сваім вікарым генэральным а. Оношко, на яго пераходзіць уся ўлада э[к]зархі на выпадак арышту або перашкодженьня, калі б а. Оношко быў перашкоджаны ўлада пераходзіць на а. Го-

[91] Гарбінскі Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы ХХ стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.51

[92] Ч. Канстантыновіч. Мае прыяцелі – В. Аношка. / Беларускія рэлігійныя дзеячы ХХ стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.266

рошку, які таксама належаць да рады Экзархату"[93].

Але ці ўсё ў дзейнасьці а. В. Аношцы было на карасьць беларускага народу, яго аб'яднаньні вакол нацыянальнае ідэі і барацьбы за незалежнасьць? У Берасьцейскім архіве мной выяўлены дакумэнты, што распавядаюць аб мэтадах унійнае дзейнасьці гэтага сьвятара, што цалкам будавалася на барацьбе з беларускім праваслаўем ды выкарыстаньня пануючага становішча Каталіцкага касьцёла ў Польшчы.

Так, у сваіх казаньнях а. Аношка так прамаўляў да праваслаўных беларусаў: "Вашы сьвятары (праваслаўныя – С.Г.) – вашы першыя ворагі, яны вас нічаму не вучаць, а толькі абдзіраюць пры кожным зручным выпадку. … Злучыўшыся з дзяржаўнай каталіцкай Царквой, вы будзеце мець усё бясплатна, і вашы цэрквы не будуць ведаць ніякіх падаткаў. Царкоўныя землі вы бы маглі падзяліць паміж безьзямельнымі і малазямельнымі."[94]

Падобныя формы дзейнасьці немінуча выклікалі супрацьстаяньне паміж беларусамі на канфэсійнае глебе і, натуральна, выклікала незадаволеньне дзеячаў беларускага нацыянальнага руху.

Зрэшты, адданая ўніяцкая праца а. Аношкі на парахфіі не выключае і ягонага ўдзелу ў беларускае палітычнай справе[95], але аб гэтым крыху далей.

Больш пытаньняў выклікаюць супярэчлівыя зьвесткі аб месцы знаходжаньня і дзейнасьці а. Льва Гарошка ад верасьня 1939 і да вясны – лета 1942 г.

Так, А. Дзедзінка (Часлаў Сіповіч) у 1966 г. падае наступныя ведамасьці аб знаходжаньні а. Льва Гарошка ў 1938 – 1944 г.г.: "З Любашова быў пераведзены ў в. Гародна..." Потым – "...у Столпцы на памошніка а. Селецкаму," і, зрэшты 15.05.1939 г. у в. "Збруж каля Маларыты і тут заставаўся да выбуху вайны". Ад восені 1939 г. і да лета 1944 г. мешкае ў Баранавічах[96].

А вось Язэп Малецкі, у 1976 г. сьведчыць: "Леў Гарошка, каталіцкі сьвятар усходняга абраду, адзін зь выдатных беларускіх дзеячоў, у часе нямецкага паходу на Ўсход быў на беларускім Палесьсі, якое, паводле гітлераўскага пляну распадзелу ўсходніх прастораў, адміністрацыйна прыразалася да Райхскамісарыяту Ўкраіны. Там, у сваёй парафіі, з прыходам Немцаў ён ня толькі дзеіў у кірунку хрысьціянскае рэлігійнае супольнасьці, але й ставіў вострa дамаганьне, каб Палесьсе, як беларуская прастора, мела беларускую адміністрацыю й школьніцтва. За гэта а. Л. Гарошка апынуўся пад украінскім і мясцовым праваслаўным абстрэлам, і нямецкі камісар загадаў высяліць яго зь Пінскай акругі без права павароту. Айцец Леў Гарошка тады пераехаў да Баранавіч, тут знайшоў падтрыманьне др. В.Войтэнкі, тагачаснага бурмістра места, ды ўладзіўся ў рэдакцыі "Баранавіцкай газэты." [97]

Чаму такія разьбежнасьці? І гэта пры тым, што на час напісаньня і выхаду кнігі Я. Малецкага а. Леў Гарошка быў яшчэ жывы. Ён мог вельмі проста запярэчыць няпраўдзівыя дадзеныя. Але, што асабліва цікава, у дакумэнтах Баранавіцкага СД ёсьць згадка аб высяленьні Л. Гарошкі з Пінскай акругі[98]. Таму дадзеныя Я. Малецкага праўдзівыя і а. архімандрыту было няма чаго запярэчваць. Вынікае чарговае пытаньне: Чаму рэлігійныя біёграфы а. архімандрыта яшчэ пры ягоным жыцьці вырашылі "падкарэктаваць" яго біяграфію? На гэтае пытаньне мы паспрабуем адказаць крыху пазьней.

Паводле Ч. Сіповіча, а. Леў Гарошка, пазбаўлены ўсялякае працы, сам у канцы вясны – пачатку лета 1941 г. знаходзіць экзарха А. Неманцэвіча і неўзабаве едзе зь ім на сабор экзархаў у Львоў[99] (13-16 чэрвеня 1941 г.).

Сам экзарх Неманцэвіч прыводзіць больш падрабязныя дадзеныя: "Экзарха на сьв. Сьв. Юра езьдзіў да Дэлятыч, там было людзей поўная царква, апрача экзархі зь настаяцелем служыў навуку а. Горошко; гэта ўрачыстасьць вельмі дадатна ўплынула на веруючых."[100]

Такім чынам, экзарх і два будучыя сябры Беларускага грэкакаталіцкага экзархату сустрэліся на парахфіі а. В. Аношкі ў па-



[93] ЦДГАЛ, ф. 201, ап.1, спр.16, арк.33,33 адв., арыгінал, рукапіс.
[94] Берасьцейскі абласны архіў, ф. 2059, ап. 1, сп. 82, б.б. 3-4
[95] Гарбінскі Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск —Мюнхен, 1999. б.8.
[96] А. Дзедзінка [Часлаў Сіповіч]. Айцец Леў Гарошка – Архімандрыт. / Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.281 – 282.
[97] Язэп Малецкі. Пад знакам Пагоні. Таронта, Пагоня, 1976., эл.вар. www.knihi.com
[98] ZStL AR-Z 94/59, Bd. IX, Bl. 844; Bd. VIII, Bl. 2389.
[99] А. Дзедзінка [Часлаў Сіповіч]. Айцец Леў Гарошка – Архімандрыт. // Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.282.
[100] ЦДГАЛ, ф. 201, ап.1, спр.16, арк.33,33 адв., арыгінал, рукапіс.

чатку траўня 1941 г.[101] Хто канкрэтна быў ініцыятарам гэтай сустрэчы невядома.

Узгадаем, а. А. Неманцэвіч быў зацьверджаны на пасадзе экзарха ў верасьні 1940 г. Таму меў дастаткова часу, каб адшукаць а. Л. Гарошуку ды запрасіць яго да супрацы. Тым больш, што яны былі знаёмыя. У 1938 г. а. Неманцэвіч нават наведваўся да а. Льва Гарошкі ў в. Гародна[102]. Магчыма не жадаў гэтага рабіць? Ды і сам а. Л. Гарошка да вясны 1941 г. відавочна ня шукаў кантактаў зь а. Неманцэвічам, бо месца знаходжаньня апошняга – Альбярцін было добра вядома.

Паспрабуем прааналізаваць паводзіны а. Л. Гарошкі з пункту гледжаньня грэка-каталіцкага сьвятара.

Непасрэдным рэлігійным кіраўніком а. Льва на той час зьяўляўся рыма-каталіцкі біскуп Я. Букраба. І, згодна кананічнаму праву, на любы пераход у іншую парахфію (іншае месца пражываньня) альбо іншую юрысдыкцыю а. Гарошка мусіў абавязкова мець згоду "свайго" уладыкі. Тым больш, што б. Я. Букраба быў у межах дасягальнасьці – зь восені 1939 г. стала знаходзіўся ў Львове. Таксама ў Львове а. Гарошка вучыўся і быў рукапакладзены ў сьвятары ва ўласнай капліцы мітрапаліта А. Шэптыцкага. Ён меў цудоўныя адносіны зь найбліжэйшым супрацоўнікам Шэптыцкага – будучым патрыярхам УГКЦ І. Сьліпым. І, зрэшты, менавіта ў Львове знаходзіўся тады рэальны цэнтр грэка-каталіцкага руху.

Таму, згодна звычайнай лёгіцы чалавека каталіцкага кліру (сьвятара), калі б а. Леў Гарошка пасьля верасьня 1939 г. ня меў парахфіі альбо жадаў зьмяніць месца пражываньня, юрысдыкцыю, ён мусіў ехаць менавіта ў Львоў.

Тут варта павярнуцца да пастаўленага вышэй пытаньня аб незразумелых "падчыстках" біяграфіі а. архімандрыта.

Як вядома, у 1939 і 1941 гадах Палессьсе робіцца цэнтрам палітычна-ўзброенай барацьбы беларускага народу за незалежнасьць.

Так, яшчэ да пачатку вайны, частка беларускага актыву ўстала на шлях узброенай барацьбы (праект Заходне-Беларускай Рэспублікі). Нават пачалося фармаваньне часовага беларускага ўраду[103].

[101] Сьвята сьв. Юра Пераможца адзначаецца: па старому стылю 23 красавіка, па навому – 6 траўня. У міжваены час грэка-каталікі пераважна выкарыстоўвалі стары стыль.

[102] а. Л. Гарошка. Айцец Антон Неманцэвіч. // Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.344.



З пачаткам нямецка-польскае вайны беларусы выступілі са зброяй у руках супраць палякаў[104]. Вядома, хаўрус камуністаў і фашыстаў ня даў зьдзейсьніць пляны беларускіх паўстанцаў.

Але з прыходам новай, савецкай акупацыі падпольная барацьба не згасае. Падпольныя беларускія нацыянальныя групы працягваюць падтрымліваць сувязь зь замежнымі цэнтрамі. Найперш – з групай В. Гадлеўскага. Адбываецца пераарыентацыя беларускага нацыянальнага руху на супрацу зь няметчынай, як адзінай альтэрнацыві сталінскаму рэжыму.

З усіх успамінаў аб падобных кантактах дзеля нас асабліва важныя ўспаміны Міколы Шчорса аб кантактах зь настаўнікам Віктарам Чабатарэвічам зь Стоўбцаў[105]. Узгадаем, менавіта ў Стоўбцах знаходзіўся а. Гарошка да траўня 1939 г.

Цяжка паверыць, што такі шчыры беларускі патрыёт як а. архімандрыт Леў Гарошка не імкнуўся ўсталяваць кантактаў з іншымі беларускімі патрыётамі, дзе б ён не знаходзіўся, альбо заставацца ў баку ад беларускай справы. Таму ёсьць усе падставы лічыць яго задзейнічаным у беларускіх справах, у тым ліку і ў нацыянальнай кансьпірацыі напярэдадні пачатку нямецка-савецкай вайны.

Група кс. В. Гадлеўскага ад 1940 г. актыўна супрацоўнічала з Абвэрам і менавіта яна ініцыявала стварэньне "Першага беларускага штурмовага зьвязу" – беларускай вайсковай адзінкі ў складзе нямецкай арміі[106]. Першая група беларускіх дэсантнікаў была перакінутая ў Беларусь самалётам 15 чэрвеня 1941 г. зь заданьнем правядзеньня дывэрсіі на чыгунцы Баранавічы — Стаўбцы.

Варта ўзгадаць і беларуска-украінскую вайсковую апэрацыю на Палесьсі ў жніўні – верасьні 1941 г. Калі беларускія атрады пад кіраўніцтвам Ус. Родзькі і М. Вітушкі ды ўкраінскія атрады Т. Бульбы-Бараўца вызвалілі ад расейска-бальшавіцкіх захопнікаў і часова ўзялі пад нацыянальны кантроль вялізную тэрыторыю ад Алеўска да Мазыра[107]. Улічвая і шчыльныя кантакты а.Л. Гарошкі з украінскімі нацыяналістамі, прынамсі ў часе служэньня ў в. Гарадна, паўс-

[103] Стасевіч Ю. Паўстаньне 1-17 верасьня 1939 г. на Палесьсі і ЗБР // Беларускі голас, 1979, № 273, люты.

[104] Хмара С. Успаміны пра Грамаду // Пагоня, 1995, № 3, 20-26 студзеня.

[105] М. Ш. Над сьвежаю магілаю // Беларуская думка, 1964, № 6, б.30.

[106] Грыбоўскі Ю. Першы штурмовы зьвяз. Да гісторыі стварэньня й дзейнасьці беларускіх камандас у гады Другой сусьветнай вайны // Беларускі Рэзыстанс, 2005, № 1 (2), б.3-23

[107] http://www.geocities.com/uno_montreal/bulba_table.htm

тае лягічнае пытаньня: ці ня браў чынны ўдзел у гэтых падзеях (у якасьці капэляна аднаго з беларускіх альбо ўкраінскіх атрадаў) а.Леў Гарошка?

Дарэчы, варта ўзгадаць, што на першым этапе вайны Ватыкан дэ-факта падтрымліваў Няметчыну. Апошняе засьведчвае і ліст прэзыдэнта ЗША Ф. Рузьвельта Пію XII ад 3 верасьня 1941 г.: "На жаль, Ваша сёньняшняя пазіцыя хутчэй прыносіць карысьць нямецкаму боку."[108]

Вышэй выкладзеныя факты робяць зразумелымі спробы біёграфаў, а магчыма і самога а. Льва, падрэдагаваць ягоную біяграфію. Бо тагачасны (паваены) Рым спрабаваў усяляк унікаць нагадваньня аб кантактах зь нямеччынай у час II Сусьветнай вайны[109]. І тым больш факт усялякага ўдзелу ва ўзброена-палітычнай барацьбе каталіцкага сьвятара і, на 1966 г., архімандрыта ордэну Марыянаў.

Як я ўжо казаў вышэй, мітрапаліт А. Шэптыцкі прапаноўваў пасаду Беларускага грэка-каталіцкага экзарха кс.В. Гадлеўскаму і кс. Ад. Станкевічу – вядомым дзеячам беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. І толькі пасьля іх адмовы – а. А. Неманцэвічу. Калі дапусьціць, што а. Л. Гарошка быў удзельнікам беларускага нацыянальнага падпольля альбо падтрымліваў зь ім сувязі, а запярэчваць гэта лягічных падставаў няма, цалкам магчыма, што шукаў ён а.А.Неманцэвіча і прапаноўваў свае паслугі менавіта на даручэньне беларускага падпольля.

Прадбачаючы магчымыя запярэчваньні апанэнтаў, адразу засьведчу: Выкладзеныя вышэй вэрсія аб удзеле а. Льва Гарошка ў палітычных падзеях 1939-1942 г.г. зьяўляецца толькі і выключна гіпотэзай. Будзем спадзявацца – знойдуцца дакумэнты адчыняючыя сапраўдныя падставы "падчысткі" біяграфіі славутага беларускага сьвятара.

Найбольш загадкавай падаецца і асоба а. Яна (Івана, Іаана?). Гэрмацюка. А ні ў успамінах а. Льва Гарошкі (ён яго наогул не ўзгадвае), а ні ў грунтоўнай працы Ю. Гарбінскага мы не знаходзім ведамасьці аб біяграфіі гэтага сьвятара. Разам з тым, у імяным паказчыку сваёй манаграфіі, Ю. Гарбінскі называе Я.

[108] Роод Вим, Рим и Москва: отношения между Святым престолом и Россией / СССР в период от Октябрьской революции 1917г. до 1 декабря 1989г. Львов, 1995. б. 122

[109] Политика Ватикана в годы Великой Отечественной войны. М., 1965 г. б.34



Гэрмацюка "праваслаўным сьвятаром"[110], таму лягічна зрабіць выснову аб тым, што ён перайшоў у грэка-каталіцтва з Польскае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы.

Што праўда, "праваслаўная" вэрсія Ю. Гарбінскага супярэчыць дадзеным аб асобе нейкага а. Я. Гэрмацюка, якія ўтрымлівае часопіс "Да Злучэньне". Вось што пісаў А. Неманцэвіч пра Гермацюка: "а. Гермацюк з г. Львова, з паходжаньня лацінянік, быў у працягу 3-х гадоў на багаслоўскім факультэце ў Вільні і быў гадунцом Віленскае Духоўнае Сэмінарыі, пасьля старшым вучыцелем народнае школы. Пераканаўшыся на гэтай пасадзе, што праваслаўнае насяленьне, перш за ўсё, мае патрэбу праўдзівае веры, рашыў прыняць духоўны сан і паступіў у Папскую Духоўную Сэмінарыю ў Дубне на Валыні, дзе рыхтаваўся да місіянэрскае душпастырскае працы ў Віленскай япархіі. За гэты час вывучыў ён таксама расейскую і беларускую мову"[111]. Гермацюк вучыўся за кошт віленскага архіяпіскапа Р. Ялбжыкоўскага. 14 студзеня 1934 г. Гермацюк у дубненскай царкве быў узьведзены ў дыяканскі сан[112]. "Пад рэдакцыяй а. Іоана Гэрмацюка" у некалькіх мовах у Дубненскай сэмінарыі выдаваўся часопіс "Друг"[113] (у бібліятэцы знайшоўся расейскамоўны асобнік, але па-беларуску часопіс не выдаваўся – С.Г.). "Дубно. Назначэньне новапасьвячаных сьвяшчэньнікаў …2) а. І. Гэрматюк у Застаўі, Роўненскага пав., арганізуе парафію"[114]. А ў часопісе "Да Злучэньне" № 12 ад сьнежня 1934 г. згадваецца ўдзел а. Іоана Гэрмацюка ў сьвяце Сьв. Параскевы ў Мятыне, разам зь а. Ільянам Гукам. Гэрмацюк прыехаў туды са сваім хорам. Апошнія вядомыя зьвесткі датуюцца вясной 1935 г, калі а. Іоана Гэрмацюка перанесьлі з парафіі ў Застаўе на такое ж становішча ў Краску[115]. Аб праваслаўі а ні слова.

Але пытаньне ня толькі ў першасным веравызнаньні а. Гермацюка, а і ў часе ягонай сьмерці.

Так, у пратаколе сабору чэрвеня 1942 г. ён пералічваецца разам

[110] Наталля Мазаўка. Імянны паказальнік. / Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.697

[111] Да Злучэньне, № 2(26), 1934 г., люты

[112] Да Злучэньне, № 2, 1934, б.16.

[113] Да Злучэньне, № 7-8 (31-32), 1934 г., ліпень-жнівень .

[114] Да Злучэньне, № 11(35), 1934 г., лістапад.

[115] Да Злучэньне № 4-5 (40-41), 1935 г., красавік-травень.

з жывымі сябрамі Рады экзархату – Аношкам і Гарошкам, пра сьмерць – ні слова. А ўжо ў 1964 г. а. Леў Гарошка паведамляе: "... а. Гэрмацюк заразіўся тыфам і памёр вясной 1942 г." Пры гэтым з тэксту вынікае – заразіўся а. Гэрмацюк пры наведваньні лягероў ваенапалоных, якія ён наведваў разам зь экзархам а.Неманцэвічам[116]. Але ў іншым варыянце ўспамінаў той жа а. Леў Гарошка называе іншае прозьвішча памёршага ад тыфу сьвятара — а. Гадуцэвіч[117]. Дык дзе праўда: Калі экзарх і а. Гермацюк сапраўды жылі і працавалі разам, а.Неманцэвіч ня мог ня ведаць аб сьмерці свайго раднага. А калі мова ідзе аб а. Гадуцэвічы – дзе знаходзіўся і што сталася зь а. Гэрмацюком?

По майму меркаваньню, а.Леў Гарошка ня меў падставаў зьмяняць альбо ўтаямнічываць у 1964 г. лёс а. І. Гэрмацюка. Але толькі ў тым выпадку, калі б яго сапраўды ведаў. Што праўда, мае права на існаваньня і іншая вэрсія: Асоба а. Гэрмацюка не ўкладалася ў агульны малюнак "гісторыі і дзейнасьці Беларускага грэка-каталіцкага экзархату".

І тут варта павярнуцца да тых біяграфічных дадзеных а. Гермацюка, што падае будучы беларускі грэка-каталіцкі экзарх у часопісе "Да Злучэньне".

У Львове прыналежнасьць да рыма-каталіцкага веравызнаньня было і ёсьць сапраўды адзнакай польскай нацыянальнасьці. Украінцаў рыма-каталікоў у Галічыне тады практычна не існавала. Падобны стан рэчаў захаваўся тут і да нашага часу. Бясспрэчна – а. Гэрмацюк быў палякам. Тым больш, калі такі "прыхільнік" беларускага рэлігійнага адраджэньня як Віленскі архібіскуп Р. Ялбжыкоўскі выдзяліў кошты на яго навучаньня. Ды і характэрысьціка самой Папскай сэмінарыі ў Дубна відавочна анцібеларуская: "У Папскай сэмінарыі ў Дубне адносіны былі такімі ненармальнымі, што клірыкам забаранялася аб іх расказываць навонках. Уступ у сэмінарыю для беларусаў быў вельмі ўтруднены, бо толькі той мог быць прыняты, хто меў ад якогась ардынарыя пісьмовае пацьверджаньня, што будзе прыняты на працу." – піша а. Леў Гарошка[118]. Зь апош-

[116] а. Л. Гарошка. Айцец Антон Неманцэвіч. // Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.345
[117] Айцец Леў Гарошка. Праз навальніцы й нягоды. // Адзін Госпад, адна вера, адзін хрост. Мн., 2007. б.53
[118] Тамсама. б.47



няга вынікае – а.Гэрмацюк быў прыхільнікам польскай канцэпцыі міжваейнай нэавуніі, а менавіта – як мосту дзеля пераводу праваслаўнага беларускага і ўкраінскага насельніцтва ў рыма-каталіцтва і яго далейшага апалячаньня. Калі так, што агульнага было паміж беларускімі грэка-каталіцкімі сьвятарамі-патрыётамі і а. Гэрмацюком? Ці ня быў ён накінуты а.Антонію Неманцэвічу ў якасьці "наглядчыка" ад Польскага кліру, а можа і ад Рыму? Абодвы вэрсіі маюць права на існаваньня: Паводле польскіх крыніц, ад пачатку савецкай акупацыі Львову сабор Сьв. Юра, рэзыдэнцыя главы ЎГКЦ мітрапаліта А. Шэптыцкага, робіцца адным зь цэнтраў полькага падпольля ў Галічыні і фінансавай дапамог падпольнай Арміі Краёвай[119]. Аб гэтым пераканаўча сьведчыць былы польскій ахфіцэр Анджэй Хцюк у полькім журнале "Культура" (ч. 4/150): "…У Львові на зломе 1939-40 гадоў … незважаючы на непрыемнасьці з боку НКВД, Мітрополіт (Шэптыцкі – С.Г.) не спыніў сваёй дапамогі польскім ахфіцэрам."[120]

Таксама і Рым, як ужо казалася вышэй, не жадаў "нацыянальнай уніі" (беларускай альбо ўкраінскай). Мэта была адна – "навярненьня Расіі". Той жа Віленскі біскуп (фундатар навучаньня а.Гэрмацюка), адказваючы на абвінавачаньня ў наўмыснай русыфікацыі беларускага насельніцтва ўніяцкімі сьвятарамі зь ліку расейкіх эмігрантаў пісаў: "Калі жыхары... жадаюць, каб да іх ва ўніяцкіх цэрквах зьвярталіся па руску, ніхто ня здольны адабраць у іх гэта права."[121]

Магчыма, што зьяўляючыся прыхільнікам беларускасьці, экзарх Неманцэвіч меў непаразуменьня зь а. Гермацюком на нацыянальным грунце.

З польскай нацыянальнасьцю а. Гермацюка зьвязана і вэрсія аб ягоным удзеле ў польскім нелегальным рухе Арміі Краёвай на Слонімшчыне. Менавіта з дапамогай і падтрымкай рыма-каталіцкімі ксяндзамі (пераважна палякамі) АК зьвязаны нямецкія рэпрэсіі супраць каталіцкага кліру на тэрыторыі Беларусі. Пакідалі жадаць

[119] Пастирський лист митрополита Андрея Шептицького до поляків. Про невідома послання столітньої давності. Видання Прес-служби Патріархії УАПЦ. Бібліотечка сайту uaoc.net. б. 2
[120] Тамсама б. 7
[121] List Pasterski Arcybiskupa Wilenskiego R. Jalbrzykowskiego (11 Lutego 1923 г.). Wilno, 1923 г.

лепшага і польска-беларускія адносіны. Таму цалкам магчымы ўдзел а.Гермацюка ў польскім падпольлі і ягонае гібель альбо знаходжаньне на нелегальным становішчы ў 1942 г., а таксама магчымыя нацыянальныя непаразуменьня зь экзархам ды іншымі сябрамі Рады экзархату. Да гэтай вэрсіі я яшчэ павярнуся, калі буду разглядаць падставы арышту а. Антонія Неманцэвіча.

А можа існавала два а. І. Гэрмацюка: былы рыма-каталік і праваслаўны сьвятар? Сьлед першага губляецца пад час II Сусьветнай вайны. Другі, перашоўшы ў вунію праваслаўны беларускі сьвятар, жыве разам зь а.экзархам, наведвае лягеры ваенапалоных і памірае вясной 1942 г. А магчыма, неведаючы лёс а. Гермацюка альбо нежадаючы распавядаць ня вельмі прыемныя дзеля іміджу экзархату і асабіста а. Неманцэвіча падрабязнасьці, а. Леў Гарошка пайшоў на сьвядомае аб'яднаньня лёсаў дзьвюх асобаў (а.а.Гермацюка і Гадуцэвіча) у адзін.

Яшчэ адно сэнсацыйнае сьведчаньня аб а. Ян Гермацюке прыводзяць у сваім арыткуле а.дыякан Я. Услшын і Апостальскі візытатар для беларусаў грэка-каталікоў а.архімандрыт Сяргей (Гаек): "***Падчас першых месяцаў нямецкай акупацыі ён*** (а. А. Неманцэвіч – С.Г.) наведваў лягеры ваеннапалонных савецкіх салдатаў у ваколіцах Слоніма, нават тады, калі там лютавала эпідэмія тыфу, а ягоны таварыш ***айцец Ян Гермацюк, у гэтых візітах заразіўшыся, памёр.***"[122]

Калі ўзгаданыя вышэй аўтары правы, а час апублікаваньня артыкулу (2007 г.) і высокая царкоўная пасада ў Каталіцкай Царкве аднаго зь іх дазваляе так меркаваць, якое дачыненьня мог мець а.Гэрмацюк да Рады экзархату, створанай толькі вясной 1942 г.?

На жаль, аспрэчыць альбо падцьвердзіць усе гэтыя гіпотэзы пакуль немагчыма. Таму асоба і дзейнасьць аднаго зь сяброў рады беларускага грэка-каталіцкага экзархату застаецца таямніцай.

Легалізацыя Беларускага экзархату праз рассылку пастырскіх лістоў адбылася толькі 5 красавіка 1942 г., а фармальнае ўтварэньне рады – 2 траўня 1942 г.[123] Да гэтага часу "памёр ад тыфу" а. Ян

[122] Дыякан Яўген Усошын, архімандрыт Сяргей Гаек. Экзах Антон Неманцэвіч верны сьведка Евангельля. // ROCZNIKI TEOLOGICZNE. Tom LIII-LIV, zeszyt 7 – 2006-2007. б. 157.

[123] а. Л. Гарошка. Айцец Антон Неманцэвіч. / Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.345



Гэрмацюк[124], але сам факт легалізацыі быў чыста фармальны. Апошняе пацьвярджаецца тым, што экзархату так і ня ўдалося дамагчыся права на богаслужэньні (альбо хутчэй проста арганізаваць іх) ня толькі ў Менску, а і ў іншых буйных гарадох Беларусі.

Сапраўды, як пішуць фактычна ўсе беларускія і ўкраінскія аўтары зь спасылкамі на таго ж а. Льва Гарошку, экзарх шмат езьдзіў. Але – выключна па заходняй і цэнтральнай частцы генэральнага камісарыяту "Беларусь". Ды і часу на рэалізацыю рэальных крокаў было вельмі мала. Ужо на пачатку ліпеня 1942 г. экзарх Антоні Неманцэвіч быў арыштаваны, а ў канцы верасьня – пачатку кастрычніка 1942 г. адбылася поўная ліквідацыя экзархату нямецкімі акупацыйнымі ўладамі[125].

Калі гаварыць аб "дзейнасьці" Беларускага грэка-каталіцкага экзархату, узьнікае яшчэ адно, цалкам лягічнае, пытаньне: **Колькі было рэальных парафій у Беларускім грэка-каталіцкам экзархаце?** Гэтае пытаньне вельмі істотна дзеля высьвятленьня сапраўдных падставаў арышту а. экзарха Антонія Неманцэвіча нямецкімі спэцслужбамі.

У даступнай нам літаратуры, у тым ліку ўспамінах а. архімандрыта Льва Гарошкі, фігуруе толькі адна рэальная парафія – Альбэрцінская. Парафія а. Вацлава Аношкі дэ факта дзейнічала толькі да Вялікадня 1942 г. (чаму так сталася, распавядзём ніжэй). Айцец. Б. Пячопка памёр, а ягоная парафія ў Бабровічах перайшла ў праваслаўе[126]. Таксама ў праваслаўе павярнулася парахфія ў Сынкавічах[127].

Дарэчы, сам пераход у праваслаўе ня заўсёды быў выкліканы дзеямі праваслаўных гіярархаў, а быў, хутчэй за ўсё, спробамі беларусізацыі "зь нізоў".

Прыкладам можа быць парахфія а. Аношкі ў Дэлятычах, якая ад пачатку зьяўлялася праваслаўнай і была зачынена ўладамі міжваенай Польшчы[128]. Падстава ліквідаваньня праваслаўнай па-

[124] Тамсама, б.348. Тут я, з агляду на магчымыя запярэчаньні апанэнтаў, прытрымліваюся "афіцыйнай" вэрсіі.

[125] Тамсама, б.348

[126] ЦДГАЛ, ф. 201, ап. 1т, справа 16, аркуш 141.

[127] ЦДГАЛ, ф. 201, ап.1, спр.16, арк. 142 адв., арыгінал, рукапіс са штампам Бел. Экзархату.

[128] Волаціч М. (Вацлаў Пануцэвіч). Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. // Запісы. Беларускі інстытут навукі й мастацтва. Т. 27., New York – Miensk, 2004. б.161.

рахфіі – прыхільнасьць да беларускай праваслаўнай аўтакефаліі, патрабаваньня беларускай мовы ў царкве[129]. Менавіта таму, парахфіяне прынялі а. Аношку, які не толькі значна зьменшыў плату за трэбы, а і даваў магчымасьць адчыніць царкву. Да таго ж ён, паводле сучасных крыніц, зьяўляўся беларускім патрыётам. Але зь восені 1942 г., практычна адразу пасьля Усябеларускага праваслаўнага сабору ў Менску, парахфія пераходзіць у Беларускую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву і застаецца ёй да зімы 1945 г., калі туды быў прызначаны сьвятар РПЦ[130]

Сам а. Леў Гарошка быў высланы немцамі ў Баранавічы, дзе займаўся выкладаньнем беларускай і лацінскай моваў у мэдычнай школе і, паводле Я. Малецкага, палітычнай дзейнасьцю. Аніякіх рэальных дадзеных аб арганізацыі ім новае парахфіі ў Баранавічах няма.

Спасылаючыся на ўласную справаздачу экзарха А. Неманцэвіча на ІІ саборы экзархаў (чырвень 1941 г.), можам уявіць стан Альбярцінскай грэка-каталіцкай парахфіі: "...царква ў Альбертыне занята праз войска пад жаўнерскае кіна, аднак служба адбываецца пад касьцёлам[131] акуратна кожнаю нядзелю і сьвята, зьбіраецца каля 20 асоб, заўсёды гаворацца казаньня па-беларуску для ўзмацаваньня веры."[132]

Натуральна, пасьля сыходу саветаў, парахфія ў Альбярціне крыху ўзбуйнілася. Немцы нават дазволіі а. Антонію ў верасьні 1941 г. асьвяціць альбярцінскую ўніяцкую царкву, зьняважаную савецкімі жаўнерамі, і заняць некалькі кельляў у манастыры. Але зноў зрабіцца сапраўдным цэнтрам нэаўнійнага руху ў Беларусі Альбярціну не судзілася. Паводле ліста кс. У. Талочкі да мітрапаліта А. Шэптыцкага: "У Альберціні з усходніх айцоў ёсьць толькі др. А. Неманцевіч. З "усходнікаў" больш нікога. Можа яшчэ які братчык-служэбнік."[133]

---

[129] Заблоцкая Ю. Сьведчаньня аўтару ад жніўня 1989 г.

[130] Ёсьць дадзеныя, што летам 1943 г. немцы спалілі вёску Бабровічы, але зь зімы 1945 г., па маім дадзеным, там служыў сьвятар РПЦ МП. Таксама няма дадзеных аб забойстве немцамі праваслаўнага сьвятара в. Бабровічы ў 1943 г. Таму цалкам магчыма, што вяскоўцы і сьвятар БАПЦ перахоўваліся ў лесе.

[131] Па сьведчаньню альберцінскіх грэка-каталікоў, набажэнствы патаемна адбываліся ў сутарэньнях мясцовага касьцёла зь восені 1939 г., калі ў Альберціне знаходзіўся ўніяцкі сьвятар а. Вальтэр Цішэк.

[132] ЦДГАЛ, ф. 201, ап.1, спр.16, арк.33,33 адв., арыгінал, рукапіс.

[133] ЦДГАЛ, ф. 201, ап. 1, спр. 114, арк. 5



Такім чынам, а. А.Неманцэвіч нават ня меў кандыдатаў для высьвячэньня ў сьвятары альбо памагатых у катэхізічнае і празэлітыскае дзейнасьці.

Тэарэтычна да ліку грэка-каталіцкіх пляцовак на тэрыторыі Беларусі магчыма залічыць г.Лепель і в. Бароўку ў Віцебскай вобласьці, дзе ад канца сакавіка і да сярэдзіны лістапада 1942 г. адпраўляў богаслужбы капэлян 201-га ўкраінскага паліцэйскага батальёну а. "Д"[134] (а.Д. Ковалюк)[135]. Што праўда, на сёньня невядома: ці былі гэтыя богаслужбы агульныя ўкраінскіх ваякаў і мясцовага насельніцтва; ці пераважна абмяжоўваліся толькі ўкраінцамі — ахфіцэрамі і жаўнерамі батальёну. Разам з тым, а ні а. архімандрыт Л. Гарошка, а ні ўкраінскія дасьледчыкі, не ўзгадваюць аб кантаках гэтага ўкраінскага капэлана зь а.экзархам А. Нэманцэвічам. Апошні факт вельмі дзіўны, бо а.капялян Д. Ковалюк мусіў паведаміць экзарха аб сваёй прысутнасьці на тэрыторыі экзархату (калі не асабіста, дык лістом). Згодна кананічнаму праву, мусіла паведаміць аб а. Д. Кавалюке беларускаму экзарху і львоўская адміністрацыя УГКЦ, бо ён, як капэлян, знаходзіўся пад асабістым кіраўніцтвам мітрапаліта А. Шэптыцкага.

Цалкам магчыма, што замоўчваньне кантактаў капэлана 201-га ўкраінскага батальёну і экзарха А. Неманцэвіча вынікае з іх выключна палітычнага характару. З агляду на таемны характар гэтых кантактаў, адсутнасьць дакумэнтаў аб іх цалкам абгрунтавана. Тым больш, што галёўныя фігуранты падзеяў (міт. А.Шэптыцкі, а.А. Неманцэвіч, кс. В. Гадлеўскі, м. Лебедзь і Р. Шухевіч) памёрлі альбо загінулі.

Таксама цалкам магчыма, што замоўчваньня дзейнасьці капэлана ўкраінскага батальёну і невыкарыстаньня ягонай прысутнасьці для пашырэньня грэка-каталіцтва ва Ўсходняе Беларусі мела не толькі вайскова-палітычныя, а і рэлігайна-абрадавыя падставы. Бо, па сьведчаньню шматлікіх украінскіх рэлігійных дасьледчыкаў, грэка-каталіцкі абрад таго часу быў моцна "лацінізаваны"[136] і відавочна адрозьніваўся ад ужываемага на тэрыторыях экзархатаў, як праз загады самога мітрапаліта А. Шэптыцкага, так і праз загады кіраўніцтва езуіцкага ордэну.

---

[134] Євген Побігущий. Мозаїка моїх споминів.// http://lib.galiciadivision.com/ren/r205.html

[135] Зачепа А. Капелани Дивізії "Галичина". Львів, 2006. б 7

[136] Гл. працу: С. Софія Сеник. Латинізація в Українській католицькій Церві. Люблин, 1990.

Мітрапаліт А. Шэптыцкі ў лісьце да кардынала Яўгена Тысерана ад 14 жніўня 1943 г. узгадоўвае толькі двух дзеючых уніяцкіх беларускіх парахаў — у Вільне і Варшаве (аб Беларусі – а ні слова). Абодва гэтыя парахфіі знаходзіліся па-за межамі дасягальнасьці экзарха зь агляду на ваенна-палітычнае становішча. А паколькі мітрапаліт ведаў аб арышце экзарха а.Неманцэвіча, але падае дадзеныя аб а. В. Гадлеўскам як жывом і не арыштаванам[137], магчыма датаваць ягоныя дадзеныя восеньню – пачаткам зімы 1942 г. Падобная датаваньня супадае і з павяртаньням у Львоў 201-га ўкраінскага батальёну пад камандай Я. Побігушчага, які да пачатку сьнежня 1942 г. знаходзіўся ў Беларусі. Украінскі грэка-каталіцкі сьвятар а. Д. Кавалюк, капэлан батальёну, верагодней за ўсё, і праінфармаваў аб беларускіх рэлігійных справах мітрапаліта А. Шэптыцкага[138].

У выніку маем, на час легалізацыі і дзейнасьці Беларускага грэка-каталіцкага экзархату, ня больш чатырох дзеючых парафій, аб якіх маюцца канкрэтныя ўзгадкі. І толькі адну – Альбярцінскую, дзе праводзіліся набажэнствы на тэрыторыі генэральнага камісарыяту "Беларусь" і якая непасрэдна ўваходзіла да складу беларускага грэка-каталіцкага экзархату. Куды дзеліся іншыя парафіі і сьвятары, і чаму аб іх няма згадак у ваеннай і паваеннай беларускай уніяцкай літаратуры, застаецца пакуль "таямніцай". Але відавочна – у складзе экзархату іх рэальна не было.

А зараз параўнаем вынікі працы Беларускага грэка-каталіцкага экзархату зь вынікамі працы двух украінскіх экзархатаў, якім, нябыта, не далі дзейнічаць. Так, ужо ад кастрычніка 1941 г. грэка-каталіцкая царква дзейнічала ў Кіеве (2 сьвятары)[139]; на Холмшчыне і Падляшшы было 40 "уніяцкіх станіц", 15 сьвятароў і два дыяканы[140]. Згадзіцеся, досыць уражваючы малюнак. І гэта пры тым, што "новая нямецкая ўлада ставіцца прыхільней да праваслаўных, чым да каталікоў."[141], а "нацыяналісты (украінскія – С.Г.) падтрымліваюць аўтакефальную Царкву і за любы кошт змагаюцца за ўкраініза-

[137] Церква і Церковна єдність. Документи і Матеріали 1899 – 1944. Львів, 1995. б.465.

[138] Гэта яўчэ адзін ускосны доказ кантактаў капеляна 201-га ўкраінскага батальёну з бел. грэка-каталікамі.

[139] ЦДГАЛ, ф. 201, ап. 1т, спр.16, арк. 147

[140] ЦДГАЛ, ф. 201, ап. 1т, спр.16, арк. 141

[141] ЦДГАЛ, ф. 201, ап. 1т, спр.16, арк. 141



цыю багаслужбаў.[142]"

**Яшчэ адзін міф-таямніца: беларускасьць тагачаснага грэка-каталіцкага служэньня.**

Мушу расчараваць тых, хто ў гэта шчыра верыць. Служэньне ў грэка-каталіцкіх цэрквах у Беларусі ў 1917 – 1942 г.г. адбывалася па-царкоўнаславянску паводле сінадальнага абраду РПЦ[143]. Аніякіх адметнасьцяў беларускае абрадавасьці XIV – XVIII ст.ст. (як праваслаўнае, так і ўніяцкае Цэркваў), аб якіх так любяць казаць некаторыя беларускія дасьледчыкі[144], тут ня можа ісьці гаворкі. Нават Евангельле і Апостал чыталіся па царкоўнаславянску. Патрэбнасьць падобнага (царкоўнаславянскага) служэньня неаднойчы падкрэслівалася апостальскім візітатарам япіскапам М. Чарнецкім[145].

Больш таго, прэс-служба Вытыкану афіцыйна падцьвердзіла, што славяна-візантыйскі (нэаўнійны) і грэка-каталіцкі (уніяцкі) абрады зьяўляюцца асобнымі і незалежнымі[146]. А аб знакамітым часопісе "Да Злучэньне" вядомы беларускі дзеяч, а. Адам Станкевіч пісаў: "...яго прымітывізму й убогасьці, сароміліся нават самі ўніяты, кажучы, што гэта езуіты на сьмех яго выдаюць!"[147]

Адзіным вядомым на сёньняшні дзень беларускамоўным выданьням Альбярцінскае нэаўнійнай місіі а.а.Езуітаў ёсьць "Катехізм Усходне-Каталіцкай Царквы". Магчыма ён выдаваўся двойчы: у 1928 і 1933 г.г. На жаль, асобнікі выданьня 1928 г. не захаваліся, а вядомы мне асобнік выданьня 1933 году захаваўся фрагмэнтарна. Яно складалася з 64 старонак, на пачатку меў кароткую гісторыю Грэка-Каталіцтва. Зьмест знаходзіўся ў канцы кнігі. Былі пададзены асноўныя каталіцкія сьвяты (згодна грэгарыянскаму календару) і пасхалія (як па грэгарыянскаму, так і па юліянскаму календару). На частцы другой старонкі ёсьць надпісы: "...па выданьню 1928 г. з дадаткамі" і "Дазволена Царкоўнаю

[142] ЦДГАЛ, ф. 201, ап. 1т, спр.16, арк. 133

[143] Восточно — католическая литургия. Варшава, 1927 г.

[144] Канфесіі на Беларусі Мінск, 1998 г., б.210

[145] Унійний зїзд у Львові. Матеріяли зібрав і упорядкував о. Володимир Кучабський. Львів, 1938. б.245

[146] Archiwum Akt Nowych w Warszawie, Ministerstwo wyznań religijnych i oświecenia publicznego, t. 392, kk. 214-217a

[147] Станкевіч А. Хрысьціянства і беларускі народ. Спроба сынтэзы. Вільня (1940), Менск (1998), Львоў 2006. б.88

уладай”. [148] Гэтая кніга амаль цалкам супадае па зьместу з рускамоўным катехізмам а. Станіслава (Тышкевіча), пабачыўшым сьвет ва Усходняй місіі а.а. марыянаў у Харбіне[149]. Цалкам магчыма – маем справу нейкай зь стандартнай распрацоўкай Рыму дзеля місійнай дзейнасьці ва Ўсходням абрадзе на землях былой Расейскай імперыі. Цікава, што ўсе цытаты (Евангельля, Апостала, Псальтыры) і малітвы прыведзены ў беларускамоўным асобніку па царкоўнаславянску.

Найбольш іскравым сьведчаньням нежаданьня зьмены моўнай палітыкі нэаўнійнай місіі ёсьць “Малітоўны псалтыр”, які пабачыў сьвет у 1939 г.[150] Месца выданьня (Варшава) дае пэўныя падставы дзеля меркаваньня, што друкаваўся ён пад рэдакцыяй а. Антонія Неманцэвіча (ва ўсялякім разе супадае зь ягоным знаходжаньнем у Варшаве). Зь аналізу мовы выданьня вынікае: царкоўнаславянская зь маскоўскай вымовай.

Ня надта зьмяніліся справы і пасьля ўтварэньня Беларускага экзархата на чале зь а. А. Неманцэвічам. Беларуская мова дазвалялася выключна як мова справаводства і казаньняў[151]. Як бачым, аб увядзеньні яе ў якасьці богаслужбовай альбо мовы чытаньня Евангельля і Апостала гаворка ня ідзе. Не ідзе мова і аб зьмене абрадавасьці. Што праўда, засталіся нейкія абрадавыя напрацоўкі Пінскіх унійных канфэрэнцыяў, але толькі на паперы.

Абаронцы “беларускасьці экзархату” могуць запярэчыць: Экзарх і сябры рады ня пасьпелі стварыць беларускія богаслужбовыя кнігі. Але справа ў тым, што іх, прынамсі Евангельля і Апостал, ня патрэбна было ствараць! Яшчэ ў 1931 г. пабачыла сьвет беларускамоўнае Евангельле ў перакладзе А. Луцкевіча[152], а ў 1935 г., пад апрабацыяй Варшаўскага сіноду Польскае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы, пабачыў сьвет праваслаўны беларускамоўны малітваслоў[153]. Больш таго, у 1939 г. выдаецца беларускамоўны “Новы Запавет” у перакладзе кс. В. Гадлеўскага[154]. Згодна з кананічным правам, экзарх (япіскап) Неманцэвіч мог дазволіць гэтыя выданьні “дзеля ўжываньня па неабходнасьці, да наступнага загаду Апостальскае сталіцы”. Паводле пастановаў II сабору экзархаў (лета 1941 г.) ён меў на гэта права. І гэта мог быць рэальны, а не міфічны крок да беларусізацыі богаслужэньня.

[148] Катехізм Усходне-Каталіцкае Царквы. Альбярцін, 1933 г.

[149] Станислав о. Католический катехизис. Харбин, 1935 г.

[150] ПСАЛТИРЬ. Варшава, 1938 г.

[151] а. Л. Гарошка. Айцец Антон Неманцэвіч. // Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. 345

[152] Новы Запавет Госпада нашага і Псальмы // Пераклад А.Луцкевіча. – Гэльсінкфорс, 1931.

[153] Праваслаўны Малітваслоў на царкоўнаславянскай і беларускай мове. – Варшава, 1935.



Яшчэ больш пытаньняў выклікае абзац зь ягонай справаздачы сабору экзархаў: “а. Экзарх пераклаў пастанаўленьня Сабору Экзаў 1940 г. “зь украінскае на расейскую ды беларускую мовы...”[155] Навошта беларускаму экзарху спатрэбіўся пераклад на расейскую мову? І чаму менавіта расейская мова займае першаснае месца ў справаздачы (нават па законах абэткі першай мусіла пісацца “беларуская”)? Ці не працягваў а.Неманцэвіч наднацыянальную палітыку езуіцкага ордэна, сябрам якога ён быў зь верасьня 1929 г., рыхтуючы пляцоўку дзела будучага місіянэрскага руху на Ўсход, у Расею. “Ад 1925 г. існавала ў Вільні Ўсходне-Каталіцкая царква ў быўшым пааўгустынскім касьцёле. Адведаў яе зь вялікай цікавасьцю й з прыкрасцю сьцвердзіў, што там панавала расейскасьць больш яшчэ, чым у расейскіх цэрквах. Парахам быў езуіт а. Мацэвіч”, — пісаў а. Леў Гарошка ў сваіх успамінах[156].

Для ўсіх застаецца загадкавым, чаму а. Неманцэвіч, калі ён сапраўды быў беларускім патрыётам ва ўсім, не зрабіў рэальных крокаў па беларусізацыі грэка-каталіцкага экзархату. Магчыма, што пытаньне мовы і абрадавасьці было прадметам асаблівых дамоўленасьцяў зь мітрапалітам А. Шэптыцкім. На ІІІ-м саборы экзархаў, які адбыўся ў Львове з 9 па 15 чэрвеня 1942 г, быў унесены пункт аб “Прыняцьці службоўніка, выдадзенага Кангрэгацыяй дзеля Ўсходніх Цэркваў”. Аб тым, як, кім і дзеля чаго рыхтаваўся ды прымаўся гэты Службоўнік у Рыме, тэма асобнага дасьледаваньня. Варта толькі нагадаць, што практычна ніхто з беларускіх уніяцкіх сьвятароў альбо ўкраінскіх грэка-каталіцкіх япіскапаў ня браў удзелу ў яго стварэньні, а галоўнай мэтай тагачаснага Рыму было як найбольш наблізіць служэньня да ўзораў РПЦ. Падчас III Сабору экзархаў падымалася пытаньня і аб украінскай мове багаслужэнь-

[154] “Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы Беларусі. 1794—1991”. Т 1. Менск, 2002, бб. 221-223.

[155] ЦДГАЛ, ф. 201, ап.1, спр.16, арк.33-33 адв., арыгінал, рукапіс.

[156] Айцец Леў Гарошка. Нашы традыцыі – наш скарб. Вільня. // Адзін Госпад, адна вера, адзін хрост. Мн., 2007. б.90

няў. Пытаньне гэта, як сьведчаць матар'ялы сабору экзархаў, падняў мітрапаліт Шэптыцкі падціскам "украінскіх нацыяналістаў і аўтакефалістаў". Толькі патрабаваньні сьвядомых украінцаў прымусілі мірапаліта Андрэя пайсьці на кампраміс і "дзе-калі правіць украінскаю альбо украінізаваць царкоўнаславянскі тэкст"[157]. Апошняе сьведчаньня дзеля нас асабліва істотна, бо менавіта нацыянальная сутнасьць беларускага грэка-каталіцкага экзархату (на думку ягоных прыхільнікаў) мусіла прыцягнуць да яго шырокія кола сьвядомых беларускіх вернікаў, але пытаньне аб беларускамоўных багаслужбах альбо нават беларусізацыі царкоўнаславянскіх тэкстаў не ўздымалася ня толькі на сабыры, а і самім экзархам Антоніям Неманцэвічам.

Тут варта зноў спыніцца на некаторых падрабязнасьцях, якія ня вельмі любяць узгадваць сучасныя ўкраінскія дасьледчыкі.

Палітыка мітрапаліта А.Шэптыцкага адносна нацыянальнага пытаньня заўсёды была двудушнай. Зь аднаго боку ён выступаў як фундатар украінскай культуры, абаронца ўкраінскіх нацыянальных інтарэсаў, зь іншага – усяляк перашкаджаў украінізацыі Грэка-каталіцкай Царквы. Ягоныя паплечнікі ня толькі рашуча выступалі супраць увядзеньня ўкраінскай мовы ў багаслужаньня, а і супраць украінізацыі царкоўнаславянскіх тэкстаў.

Так, вядомы ўкраінскі навуковец і рэлігійны дзеяч прафэсар Іван Агіенка (будычы мітрапаліт УАПЦ Іларыён), аналізуючы мову службоўніка ЎГКЦ 1930 г. (зробленага па замаўленьню і дабраслаўленьні мітрапаліта А. Шэптыцкага) піша: "Служебник о. Кархута[158] зь українською традицією має дуже мало спільного; навпаки, всі стародавні риси української церковно-слов'янської мови о. Кархут, як то ми бачили вище, скрізь старанно повикидав зо свого Служебника. Часті свідчення автора, що свою працю він грунтує на давніх памятках, то якесь непорозуміння. Стародавніх церковнословянських українських книжок автор не студіював і на них не грунтовався, а звідси вийшла і вся його методологічна хиба, бо він оперся головно на книжках московських і то нового часу."[159]

Цікава, што яшчэ зь сярэдзіны XIX ст. у Галіцкай уніяцкай мітраполіі практыкаваліся літургіі на нямецкай і польскай мовах

[157] ЦДГАЛ, ф. 201, ап. 1т, спр. 16, арк 147
[158] Зьяўляўся адным зь найбліжчых супрацоўнікаў мітрапаліта А. Шэптыцкага.
[159] Проф. Іван Огієнко. Богослужбова мова в слов'янських Церквах. Збірка рецензій на нові видання. Варшава, 1931. б. 31



і нават быў выдрукаваны асобны трохмоўны (царкоўнаславянская, нямецкая і польская) ярэйскі службоўнік[160]. Падобная практыка працягвалася да 1939 г. Дык чаму дазволена нямецкай альбо польскай і нельга беларускай альбо ўкраінскай мовамі?

З рэшты, прыкладаў крытыкі рэлігійна-нацыянальнай палітыкі мітрапаліта А. Шэптыцкага з боку вядомых дзеячаў украінскага нацыянальнага руху існуе шмат. Але ў якасьці прыкладу абагульненьня падобнай крытычнай думкі варта прывесьці адну цытату трохтомнай працы вядомага дзеяча ўкраінскага нацыяналізму Васіля Кудрыка "Малавядомае з гісторыі грэка-каталіцкай царквы", што пабачыла сьвет у Канадзе: "Найгалаўной ягонай (мітрапаліта А. Шэптыцкага — С.Г.) справай, было пашыраньне ўніі на ўсход ..."[161] А другі ўкраінскі дасьледчык дадае: "Нідзе і ніколі мітр. Шэптыцкі не назваў сябе "украінец". Калі ж аднойчы ён назваў сябе нябыта "русінам", то трэба мець на ўвазе, што ў Рыме пад тэрмінам "рутэны" (русіны) разумеюць і ўкраінцаў, і беларусаў, і маскалёў. Мітр. Шэптыцкі ўсю сваю асобу без рэшты прысьвяціў рымска-польскае місіі на славянскам усходзе, таму для ўкраінскай нацыянальнае справы ў яго не засталося месца"[162].

Як каталіцкі сьвятар, а.Антоні Неманцэвіч быў вымушаны падтрымліваць моўна-абрадавую палітыку Ватыкану і свайго непасрэднага кіраўніка – мітрапаліта Андрэя Шэптыцкага. Сёньня магчымы толькі разважаньня-спрэчкі аб асабістым стаўленьні экзарха да падобных зьяваў.

На маю думку, прыведзеныя вышэй факты і рашэньня III Сабору экзархаў практычна прыпынялі існаваньня беларускага экзархату як асяродка менавіта беларуска-нацянальнага. Апошняе пакідала яго па-за межамі тагачаснага беларускага рэлігійна – палітычнага жыцьця, бо ён губляў цікавасьць дзеля сьвядомага беларускага актыву і пераважнай большасьці сьвядомых беларусаў наогул.

[160] Чинъ Священния й Божественния літургіи. Львов, 1858.
[161] Кудрик В. Маловідоме з історії греко-католицької церкви. Т. II, Вінніпег, Манітоба, 1955 р. б. 9-10
[162] Пастирський лист митрополита Андрея Шептицького до поляків. Про невідома послання столітньої давності. Видання Прес-служби Патріархії УАПЦ. Бібліотечка сайту uaoc.net. б. 7


На правах рукописи

Иждивением Святейшей Конгрегации по Делам Восточных Церквей
Трудом Рим. - Католической Семинарии «Руссикум»
Roma (128), Via Carlo Cattaneo, 2

УТРЕНЯ В ЛАЗАРЕВУ СУББОТУ

*См. Служебник, стр. 84-127*

Начало утрени и обычное моление, как указано в Служ., стр. 84.

Св. «Слава святей...».
Чт. Шестопсалмие.
Св. Вел. ектения (на амвоне).
«Бог Господь». Священник идет в алтарь.
Х. Тропарь.
Чт. Кафизма.
Св. Мал. ектения.
Чт. Седален из Триоди.
Х. Кафизма 17-ая "Непорочны".
Тропари воскресные «Ангельский собор...»; открываются царские врата, каждение по обычаю.
Св. Мал. ектения.
Чт. Седален из Триоди.
Х. «Воскресение Христово видевше...».
Чт. Псалом 50-ый.
Х. Канон.
После 3-ей песни мал. ект. и седа-

*Падручнік Каталіцкае сэмінарыі "Русікум", выдадзены "Сьвяцейшай кангрэгацыяй па Справам Усходніх Цэркваў". Рым, 1945 г. Як бачым, расейскамоўныя ўніяцкія падручнікі, у адрозьненьні ад украінскіх і беларускіх, распрацоўваліся і выдаваліся*

Сыходзячы зь вышэй выкладзенага, ставім яшчэ адно пытаньне: **Ці магчыма, што арышт і далейшая сьмерць а. экзарха А. Неманцэвіча была вынікам ягонай пастырскай дзейнасьці?**

Пераважная большасьць сучасных грэка-каталіцкіх дасьледчыкаў сьлепа паўтараюць адказ, зроблены а. Л. Гарошка яшчэ ў канцы 50-х гадоў ХХ ст.: Арышт а. Антонія Неманцэвіча — вынік даносаў і інтрыгаў праваслаўна-прарасейскіх колаў. Прыводзяцца нават дадзеныя аб актыўнасьці ў Слоніме падпольнай сеткі расейскіх арганізацыяў "Трудавой Саюз" і "Брацтва Рускай Праўды", блізкасьць Жыровіцкага праваслаўнага манастыра[163]. Разгортваючы тэзіс а. Льва, але нябыта з беларуска-праваслаўна-

[163] а. Л. Гарошка. Айцец Антон Неманцэвіч. // Беларускія рэлігійныя дзеячы ХХ стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.346



га боку, Вацлаў Пануцэвіч[164] (Ю.Гарбінсікі падае яго як "аднаго зь відных каталіцкіх сьвецкіх дзеячаў беларускага замежжа"[165]!?) практычна дадае, што ўладыка Неманцэвіч зрабіўся ахвярай супрацьстаяньня праваслаўнага архіяпіскапа Філафея і беларускага актыву ў справе абвяшчэньня БАПЦ[166].

На маю думку, вылучаныя а. Л. Гарошкам і ў далейшым В. Пануцэвічам "праваслаўныя" падставы арышту экзарха Неманцэвіча калі і адыгралі нейкую ролю, але ўсё ж далёка не галоўную. Зрэшты, узгаданыя вышэй арганізацыі былі палітычнымі і абвінавачвалі экзарха А. Неманцэвіча менавіта ў анцінямецкай палітычнае дзейнасьці, а менавіта — у сувязях з польскім падпольлем[167].

На вэрсіі абвінавачаньня а. Антонія Неманцэвіча ў сувязях з польскім падпольлям варта спыніцца асобна.

Як я пісаў вышэй, цалкам магчыма, што ўдзельнікам польскага падпольля мог зьяўляцца а.Гермацюк. Калі ён жыў і працаваў разам зь экзархам, Альбярцінскі кляштар езуітаў цалкам мог быць аднай зь явак польскай канспірацыі і ў менавіта ў гэтай якасьці зацікавіў СД. Паўстае пытаньня: Ці быў а. Антоні Неманцэвіч утаямнічаны ў справы свайго радніка? Верагодней усяго так, бо схаваць нешта ад чалавека зь якім разам жывеш у кляштары надзвычайна цяжка і, магчыма, экзарх у нейчым прыкрываў а. Гэрмацюка. Узгадаем, немцы вельмі жорстка ставіліся не толькі да ўдзелу ва ўзброеным змаганьні, а нават да непаведамленьні аб падобных асобах – да растрэлу ўключна. Аб уплыве дзейнасьці польскай канспірацыі на лёс каталіцкага сьвятарства на Беларусі піша і праваслаўны архіяпіскап Афанасі (Мартас): "Польская канспірацыйная праца супраць немцаў адбілася на лёсе каталіцкага сьвятарства ў Беларусі"[168] Таму "сувязі з польскай канспірацыяй" нельга скідываць зь вагаў,

[164] Праца Волаціч М. (Вацлаў Пануцэвіч)."Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква." Была надрукавана пасьля сьмерці аўтара па рукапісам у апрацоўцы А. Гардзіенка.

[165] Гарбінскі Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы ХХ стагоддзя. Мінск-Мюнхен, 1999. б.141

[166] Волаціч М. (Вацлаў Пануцэвіч). Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. // Запісы. Беларускі інстытут навукі й мастацтва. Т. 27., New York – Miensk, 2004. б.191-192

[167] ZStL AR-Z 94/59, Bd. IX, Bl. 2703; Bd. III, Bl. 937

[168] Архиепископ Афанасий Мартос. Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни. Издание третье, исправленное и дополненное. под общей редакцией Его Преосвященства Александра (Милеанта), епископа Буэнос-Айресского и Южно-Американского. Буэнос-Айрес, 2003. б, 311

калі разглядаеш падставы арышту экзарха.

Дарэчы, сымпаціі а.Антонія Неманцэвіча да Польскага нацыянальнага руху ды ягоная дзейная падтрымка маглі быць выкліканы і асабістымі падставамі. Мала хто ведае, што ў экзарха быў малодшы брат: Неманцэвіч Іван Іванавіч (Ян Янавіч), 1895 г.н., які пазіцыянаваў сябе палякам і зьяўляўся актыўным практыкуючым вернікам Рыма-каталіцкага касьцёлу і нацыянальных польскіх суполак у Пяцербурзе, а потым – у Леніградскай вобласьці. Менавіта за польскую нацыянальную дзейнасьць Неманцэвіч І.І. быў прыгавароны Камісіяй НКВД 17 студеня 1938 г. па артыкулу 58-6-11 УК РСФСР да вышэйшае меры пакараньня і быў растраляны 27 студзеня 1938 г. у Ленінградзе[169].

А вось рэлігійная дзейнасьць а.Неманцэвіча у Беларусі не была сакрэтам для нямецкіх спэцслужбаў, бо вялася яна яўна і ня прыхоўвалася. Да таго ж, арышт экзарха не прывёў да арышту іншых сяброў Беларускага грэка-каталіцкага экзархату: а.а. Л. Гарошкі і В. Аношкі. І, што на наш погляд асабліва істотна дзеля высьвятленьня сапраўдных матываў арышту, гэтыя сьвятары не жылі разам зь экзархам у Альбярцыне.

Сама легалізацыя Беларускага грэка-каталіцкага экзархату адбылася ў часе пачатку рэальных змаганьняў беларускага актыву за абвяшчэньня БАПЦ. У гэтай справе беларускі актыў дамогся падтрымкі гаўляйтара Беларусі В. Кубэ. Таму, калі б уніяты складалі сапраўдную пагрозу беларускае аўтакефаліі або шкодзілі нямецкім акупацыйным плянам, немцы ніколі б не далі дазволу на легалізацыю і дзейнасьць экзархату.

Усе міты ўніяцкіх дасьледчыкаў, у тым ліку і а. Льва Гарошка, аб тым, што арышт экзарха А.Неманцэвіча быў інспіраваны праваслаўным беларускім колам, пераканаўча разьбівае той жа В. Пануцевіч: “Ведама, многія правасл[аўныя] варожа адносяцца да Вуніі, але гэта не значыць, што дзеля гэтай варожасьці немцы ліквідавалі-б а. Неманцэвіча — Беларускага Экзарха. То-ж Генэральны Камісар Беларусі ў сакавіку 1942 году выдаў быў афіцыяльную грамату на існаваньне Беларускага Экзархату, у травені таго-ж году шырока абвесьціла кантраляваная немцамі беларуская прэса існаваньне Экзархату зь волі немцаў, дык звычайная варожасьць праваслаўных да Вуніі ня мела-б значэньня, каб скасаваць гэты Экзархат. Аргумэнт, што ў гэтым часе тварылася

[169] Ленинградский мартиролог т.8. (эл.вар.)



БАПЦарква, таксама не вытрымоўвае крытыкі. Па-перша[е], БАПЦ пачала тварыцца ўжо ад восені 1941 г. — гэта ёсьць на пяць месяцаў раней, і немцам было вядома, што сярод беларусоў насельніцтва мяшанае: праваслаўныя й каталікі. Па-другое, самі праваслаўныя япіскапы мелі аграмадныя клопаты з беларускай незалежніцкай праваслаўнай групай, якая змушала іх да аўтакефаліі і беларусізацыі праваслаўнай царквы. Кіраўнік палітычнага аддзелу пры Ген[эральным] Кам[ісарыяце] Беларусі тэрызаваў япіскапаў пісталетам у сваім бюры, змушаючы іх на аўтакефалію, а Панцялейман быў некаторы час пад арыштам — дык дзеж тут было япіскапам займацца барацьбой зь Беларускім Экзархатам?.. Астаецца адно: падазрэньне ў незалежніцкай канспірацыі… Інакш, узьнятая абарона а. Неманцэвіча некаторымі немцамі мела-б лепшыя ўдачы”[170]

Больш таго, арышт экзарха А. Неманцэвіча адбыўся тады, калі справа правядзеньня праваслаўнага сабору дзеля абвяшчэньня БАПЦ ужо была вырашана на карысьць беларускага актыву. Ды і ня мог Неманцэвіч бяз сродкаў, трывалай сувязі з Рымам, без належнае колькасьці сьвятароў, малой колькасьцю вернікаў і адсутнасьці падтрымкі беларускага нацыянальнага актыву складаць рэальную канкурэнцыю праваслаўнай Царкве.

Паводле матэрыялаў нямецкіх архіваў, СД мела апэратыўную інфармацыю аб палітычных перамовах а. экзарха А. Неманцэвіча з прадстаўнікамі АЎН (б) пры пасярэдніцве мітрапаліта А. Шэптыцкага летам 1942 г. у Львове[171]. Але, наколькі вядома, экзарх ніколі не прымаў удзелу ў палітычнай беларускай дзейнасьці.

Застаецца толькі прыпусьціць, што кс. В. Гадлеўскі ўмовіў а. экзарха выступіць пасярэднікам пры палітычных перамовах. Невыпадкова практычна цалкам праваслаўны беларускі адзьдзел Слонімскае Самапомачы хадайнічаў перад нямецкімі ўладамі аб дазволе на паездку ў Львоў а.экзарху А.Неманцэвічу[172].

[170] Пануцэвіч В. Кс. Вінцэсь Гадлеўскі. Дзяржаўны Муж і Правадыр Народу // Беларуская царква (Чыкага), № 28, 1965 г. б.107-108

[171] ZStL AR-Z 94/59, Bd. IX, Bl. 2703; Bd. III, Bl. 939

[172] а. Л. Гарошка. Айцец Антон Неманцэвіч. // Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.347



664 Прокímны хѯд

На ᲂу҆́трени прокíменъ, гла́съ д҃, ѱал. мд҃:

Помѧнꙋ̀ и҆́мѧ твоѐ * во всѧ́комъ ро́дѣ и҆ ро́дѣ.

Стíхъ: Ѿры́гнꙋ се́рдце моѐ сло́во бла́го, глаго́лю а҆́зъ дѣла̀ моѧ̑ царе́ви.

На лїтꙋргíи прокíменъ, гл. г҃, пѣснь Бцы:

Велíчитъ дꙋша̀ моѧ̀ Гда, * и҆ возра́довасѧ дꙋ́хъ мо́й ѡ҆ Бзѣ Спа́сѣ мое́мъ.

Стíхъ: Ꙗ҆́кѡ призрѣ̀ на смире́нїе рабы̀ своеѧ̀, се́ бо ѿ ны́нѣ ᲂу҆блажа́тъ мѧ̀ всѝ ро́ди.

А҆ллилꙋ́їа, гла́съ и҃, ѱало́мъ мд҃:

Слы́ши, дщѝ, и҆ ви́ждь, и҆ приклонѝ ᲂу҆́хо твоѐ.

Стíхъ: Лицꙋ̀ твоемꙋ̀ помо́лѧтсѧ бога́тїи лю́дстїи.

Прича́стенъ, ѱало́мъ рѕ҃і:

Ча́шꙋ спасе́нїѧ прїимꙋ̀, и҆ и҆́мѧ Гдне призовꙋ̀.

*Старонка Грэка-каталіцкага службоўніка, які рэкамэндаваны Рымам у 1942 г. дзеля ўжываньня ў новастворaных экзархатах. Царкоўнаславянская мова маскоўскае вымовы.*



Цікава, што той жа В. Пануцэвіч сьведчыў, што экзарх а. Антон Неманцэвіч быў арыштаваны немцамі па справе “беларускай кансьпірацыі”: “[СД]…паездку Неманцэвіча да Шэптыцкага расцэньвала як кансьпірацыйнае шуканьне кантактаў так зь украінцамі, як і з Рымам. Памятайма, што мітр. Шэптыцкі браў актыўны ўдзел у праклямацыі незалежнай Украіны 30 чэрвеня 1941 г. у Львове і стварэньні ўкраінскага ўраду Бандэры, разагнанага немцамі. Ён-жа быў выдаў 1 ліп[еня] 1941 пастырскі ліст, заклікаючы да высілкаў у стварэньні незалежнай украінскай дзяржавы. У Львове быў цэнтар украінскай антынямецкай кансьпірацыі. Такім чынам, немцам ужо было дастаткова, што а. Неманцэвіч праўдападобна езьдзіў у Львоў з кансьпірацыйнымі заданьнямі ад групы кс. Гадлеўскага. Яны спадзяваліся, што ад яго атрымаюць больш матарыялаў у справе беларускай кансьпірацыі.”[173]

Падцьвэрджаньне працытаванай вышэй гіпотызы В. Пануцэвіча нечакана адшукалася ў часе працы над кнігай “Беларускі супраціў”, якую ад 2005 г. мы праводзілі разам зь Сяргеям Яршом.

Адзін зь удзельнікаў беларускага супраціва Ю.В. перадаў даў нам цікавыя сьведчаньні аб таемнай місіі сябра БНП і Рады Беларускага грэка-каталіцкага экзархату па мянушцы “Язафат”, якая адбывалася ў часе III сабору экзархаў у Львове. У ёй а. Неманцэвіч выступіў пасярэднікам у кантактах “Язафата” зь мітрапалітам А. Шэптыцкім, а праз апошняга – з падпольлям АЎН (б).

Няма патрэбы пераказваць гісторыю падрыхтоўкі і праведзеньня перамоваў, бо яна была тройчы надрукавана: на старонках газэты “Наша ніва”[174], у кнізе “Беларускі супраціў” [175] і часопісе “Беларускі рэзыстанс”[176]. Але варта дадаць, што факт кантактаў АЎН (б) і БНП (Беларускага супраціву) праз пасрэдніцтва мітрапаліта Шэптыцкага і экзарха Неманцэвіча не выклікае пярэчаньня і ў кіраўніка Львоўскага “Цэнтру Дасьледваньня Вызваленчага Руху” сп. Руслана Забілага.

Вэрсія аб выкарыстаньні БНП (кс. В. Гадлеўскім) экзарха Антонія Неманцэвіча для усталяваньня кантактаў з АЎН падтрымана і гісторыкам Юрыям Шаўцовым, які ў 2007 г. слушна заўважае: “Неманцэвіч быў арыштаваны гестапа за удзел у падпольнай дзейнась-

---

[173] Пануцэвіч В. Кс. Вінцэсь Гадлеўскі. Дзяржаўны Муж і Правадыр Народу // Беларуская царква (Чыкага), № 28, 1965 г. б.107.

[174] С. Горбік, С. Ёрш. Львоўская місія “Язафата” // http://nn.by/index.php?c=ar&i=4042

[175] Ёрш С., Горбік С. Беларускі супраціў. Львоў, 2006. б. 56-60

[176] С. Ёрш, С. Горбік. На два франты. // Беларускі Рэзыстанс. №1 (3), 2006. б. 5-8

ці Гадлеўскаго. Вельмі падобна на тое, што Неманцэвіч сапраўды ездзіў у Львоў у якасьці сувязнога Гадлеўскага да Шэптыцкага, а можа, і не толькі да Шэптыцкага. ... Менавіта тамака, дзе ў 42 году паўстаў першы атрад Аўнаўскай УПА - у Столінскім раёне, у яго паўднёвай часцы і была структура ГКЦ. Неманцэвіч абавязкова атрымліваў інфармацыю аб сытуацыі на месцы ў гэтым рэгіёне ад сваіх грэка-каталікоў і 100% меў магчымасьць сувязі зь мясцовай структурай АЎН. Тым больш, што менавіта ў гэтай мясцовасьці ў гэты час, падобна, была школа падрыхтоўкі камандзіраў УПА пад камандаваньнем Кліма Савура. Г.з. Неманцэвіч як, без выключэньня, ніхто іншы ў Беларусі меў прамы выхад праз сваіх парафіянаў і клір на Кліма Савура. … Больш таго, напрошваецца наогул [выснавак:] Неманцэвіч як кропка сувязі паміж Шухевічам і усім АЎНаўскім падпольлем у Заходняй Беларусі. Вельмі шмат пунктаў судотыку паміж Шухевічам і Неманцэвічам: грэка-каталікі абодва, Грыньох[177] пры Шухевічы, капялан украінскага батальёна езьдзіць у Кракаў і Варшаву з-пад Лепеля, і наўрадцы можа абыйсьці аж цэлага свайго экзарха ў такіх паездках. ... Не, Нманцэвіч павінен быў быць або сувязным або важным палітычным дзеячам, якія знаходзіліся ў кантакце і з Шухевічам і зь мясцовым падпольлем."[178]

Практычна адразу пасьля выхаду артыкула ў газэце "Наша ніва" распачалась гарачая дыскусія ня толькі аб сапраўднасьці самаго факту супрацы а. экзарха з БНП, а і асобе таямнічага "Язафата"[179]. Таму мушу крыху спыніцца на тых фактах, што не патрапілі ў нашы, зь Сяргеям Яршом, публікацыі.

Вядома, што экзарх А. Неманцэвіч езьдзіў летам 1942 г. у Львоў зь адным сябрам Рады Беларускага экзархату, але позьвішча ніхто не называе. На час III сабору экзархаў, сяброў Рады заставалася толькі двое: а.а. Гарошка і Аношка (калі прыняць агульную думку, што а.Гэрмацюк памёр)[180].

Першы на той час перабываў у Баранавічах, рэлігійнай дзейнасьцю не займаўся і, паводле ўсіх даступных крыніцаў, нікуды

[177] Тут аўтар, на маю думку, памыляецца, дадзеных аб наведваньні а.Грынёхам Бароўкі, ды і наогул Беларусі, няма. Ва ўкраінскім батальёны перабываў, як я ўжо ўзгадваў, а. Д. Ковалюк. Але сэнс сьведчаньняў ад гэтага не зьменьваецца.

[178] http://guralyuk.livejournal.com/862359.html

[179] http://www.nn.by/index.php?c=ar&i=5471

[180] Існуе непадцьверджаная вэрсія аб сыходзе а.Гэрмацюка ў адзін з атрадаў польскай АК.



не выязджаў, а вось аб а. В. Аношку сьведчаньні супярэчлівыя.

Ю. Гарбінскі падае сьведчаньне, што а. Аношка знаходзіўся ў сваёй парафіі да лета 1944 г.[181], але зьмяшчае ва ўласнай манаграфіі ўспаміны Ч. Канстанціновача зь цалкам іншымі дадзенымі.

Так, Ч. Канстанціновач сьцьвярджае, што а. Вацлаў Аношка праследаваўся партызанамі і адслужыўшы Вялікодную службу "уцёк у Наваградак... Аж у 1943 г. ... прыслаў мне ліст з пад Кракава і прыслаў свае фота."[182] Відавочна, што гаворка можа ісьці толькі аб Вялікдне 1942 г., бо менавіта вясной 1942 г. было афіцыйна абвешчана аб стварэньні экзархату і ўсе сябры рады знаходзіліся на тэрыторыі генэральнага камісарыяту "Беларусь".

Чаму месцам уцёкаў а. В. Аношка выбраў менавіта Наваградак[183] тлумачыць ня трэба, бо менавіта там жыў адзін зь лідараў БНП Барыс Рагуля і кватэравала беларуская вайсковая фармацыя. Сп. Рагуля быў і сябрам ЦК БНП, а кіраваў БНП у 1942 г. – кс. В. Гадлеўскі. Кола замкнулася. Экзарх А. Неманцэвіч і а. В. Аношка сапраўды выконвалі ў час сабору экзархаў у Львове палітычнае заданьне кіраўніка беларускае нацыянальнае кансьпірацыі В. Гадлеўскага.

Паводле апошніх дадзеных, экзарх Неманцэвіч быў арыштаваны 4 ліпеня 1942 г. у Альбярціне, пасьля вяртаньня зь Львову. Чаму немцы, калі ён быў толькі перашкодай у выкананьні пляnaў беларускае праваслаўнае аўтакефаліі, адразу альбо ў хуткім часе не расстралялі яго? Відавочна, гэстапаўцы дамагаліся ад яго нейкай інфармацыі аб беларускім нацыянальным супраціве, а, магчыма, і аб перамовах Ватыкану зь Масквой (на гэтай вэрсіі я спынюся пазьней). Толькі ў канцы зімы 1944 г. немцы паведамілі каталіцкаму біскупу Гэнрыху Вінкену, пасрэдніку паміж нямецкім япіскапатам і тагачасным урадам Нямеччыны, што япіскап Антоні Неманцэвіч "памёр у канцы 1942 г."[184] А 24 сьнежня 1942 г. быў арыштаваны і адразу расстраляны кіраўнік беларускае

[181] Гарбінскі Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы ХХ стагоддзя. Мінск —Мюнхен, 1999. б.8

[182] Ч. Канстантыновіч. Да ўспамінаў аб сьв. Пам. А. Вацлаве Аношцы (фрагмэнт). // Беларускія рэлігійныя дзеячы ХХ стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.268.

[183] Зьвестак аб тым, што а. В. Аношка зьдзесьняў рэлігійную дзейнасьць у Наваградку вясной-летам 1942 г. няма.

[184] а. Л. Гарошка. Айцец Антон Неманцэвіч. // Беларускія рэлігійныя дзеячы ХХ стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.348.

нацыянальнае кансьпірацыі а. Вінцэнт Гадлеўскі[185]. Выпадковасьць? Супадзеньне? Пакідаем гэта па-за камэнтарам. Відавочна толькі адно: менавіта палітычная, а не рэлігійная дзейнасьць была галоўнай падставай арышту і сьмерці беларускага грэка-каталіцкага экзарха а.А. Неманцэвіча.

Зрэшты, яшчэ адзін факт пацьвярджае выкананьне палітычнага даручэньня А. Неманцэвічам і В. Аношка – хуткі і таемны ад'езд апошняга з тэрыторыі Беларусі. Верагодней за ўсё, гэта сталася па рэкамэндацыі Б. Рагулі пасьля паведамленьня аб арыштце а.экзарха А. Неманцэвіча. Вядома толькі, што ўжо ў канцы верасьня – пачатку кастрычніка 1942 г. а. Л. Гарошка застаецца адзіным сябрам Рады беларускага экзархату на тэрыторыі Беларусі і прадстаўляецца адзіным наяўным у Беларусі намесьнікам экзарха[186].

Таму, абапіраючыся на ўсе сучасныя дасьледваньні, цяжка не пагадзіцца зь в. Пануцэвічам, больш мэтазгодна "зьвязка" арышту экзарха Неманцэвіча і гібелі а. Вінцэнта Гадлеўскага. Апошні зьяўляўся вядомым беларускім палітычным дзеячам, адным зь арганізатараў беларускае нацыянальнага супраціву і Беларускае Незалежніцкае Партыі.

Сёньня, у сьвятле новазнойдзеных і апублікаваных дакумэнтаў, магчыма высунуць і вэрсію, што на арышт і сьмерць а.Антонія Неманцэвіча паўплываў і "Ватыканскі фактар".

Так, у канцы зімы — пачтаку вясны 1942 г., па ініцыятыве прэзыдэнта ЗША Ф. Рузьвельта, пачынаюцца сакрэтныя перамовы паміж Масквой і Ватыканам. А на пачатку траўня 1942 г. у Маскву, па ініцыятыве савецкага ўрада, прыбыў ваенны рыма-каталіцкі япіскап Юзэфаў Гаўліна, які ў цесным супрацоўніцтве зь амбасадарам польскага эміграцкага ўрада ў Маскве Станіславам Катом і вышэйшым савецкімі вайсковым кіраўніцтвам, кіраваў арганізацыяй агітацыйнай працы сярод польскіх салдат, якія навучаліся пад Ташкентам вайскоўцу справе перад адпраўкай на фронт пад кіраўніцтвам генэрала Андэрса[187]. А ўжо 5 чырвеня 1942 г. апостальскі

[185] Завальнюк Ул., Цумараў Я. Ведаў, што ня вернецца // Наша ніва, 2002, №47, 20 сьнежня,.
[186] а. Л. Гарошка. Айцец Антон Неманцэвіч. // Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.348.
[187] Роод Вим, Рим и Москва: отношения между Святым престолом и Россией / СССР в период от Октябрьской революции 1917г. до 1 декабря 1989 г. Львов, 1995. б. 122



легат у Бейруце Рэмі Лепрэ адправіў у Рым справаздачу аб спрыяльным разьвіцьці савецкай палітыкі ў дачыненьні рэлігіі і адзначаў зьбліжэньне з Каталіцкай Царквой[188].

Перамовы паміж Піям XII і Сталіным былі настолькі пасьпяховымі, што пасол Польшчы ў Маскве Станіслаў Кот 5 жніўня 1942 заявіў апостальскаму легату ў Тэгіране: "Папа зьяўляецца найважным партнёрам па перамовах, якога Сталін пасьля вайны наведае ў Рыме, ён — маральная сіла, паважаная савецкімі кіраўнікамі"[189].

Цалкам магчыма, што ў перамовах Ватыкану і Масквы ўдзельнічаў (альбо быў у іх утаямнічаны) мітрапаліт А. Шэптыцкі. "У Францыі на зломе 1943-44 гадоў польскій кардынал Глььон казаў наступнае: "Айцец Архіяпіскап Шэптыцкі – гэта вялікі і сьвяты чалавек. Праз яго рукі передаваліся значныя фонды Апост. Сталіцы не толькі на дапамогу для польскага Сьвятарства, не толькі на дапамогу для жыдоў, якіх шмат перахоўваюць грэка-каталіцкія манастыры, але і для польскага руху супраціву, для Арміі Краёвай. Апрача грошай Ватыкану на гэтыя тры мэты , гэтым шляхом даходзяць калі-некалі і іншыя…", - так падаў інфармацыю той польскі часопіс "Культура (н. 4/150, 1960) інформацыю польскага кардынала Глььона (вядомага ворага ўкраінцаў) аб мітр. Шэптыцкам"[190].

Такім чынам, апрача вэрсіі арышта а.Неманцэвіча ў сувязі з беларускай кансьпірацыі, вынікае і вэрсія арышта ў сувязі з кансьпірацыяй польска-каталіцкай.

Сёньня ўжо вядома, што адной з тэмай перамоваў Ватыкана і Масквы быў лёс Грэка-Каталіцкае Царквы ў СССР. Як выявілі далейшыя падзеі, грэка-каталікі былі для Ватыкана і Масквы толькі разьменай манетай. У 1944 г., падчас працяглых таемных перамоў, было дасягнутая канчатковая тайная дамова, паводле якога сталінскі ўрад гарантаваў наданьня Рымска-Каталіцкай Царкве прывілеяванага становішча ў краіне, а папа Пій XII прызнаваў законным анэксію Заходняй Украіны і іншых тэрыторый, а таксама даваў згоду на ліквідацыю ЎГКЦ (практычна ўсех уніяцкіх структураў на тэрыторыі СССР), вернікаў якой ён лічыў

[188] Тамсама, б.129-130
[189] Федулов С. В. Тайный сговор. М., 1995. б. 78
[190] Пастирський лист митрополита Андрея Шептицького до поляків. Про невідома послання столітньої давності. Видання Прес-служби Патріархії УАПЦ. Бібліотечка сайту uaoc.net. б. 2

"непаўнавартаснымі каталікамі"[191].

Нягледзячы на то што перамовы паміж Крамлём і Ватыканам праходзілі ва ўмовах строгай сакрэтнасьці, інфармацыя аб гэтым вельмі хутка патрапіла ў заходнюю прэсу, што, у сваю чаргу, выклікала нездаволенасьці ў Нямеччыны. Калі канкрэтна нямецкая выведка атрымала інфармацыю аб перамовах высьветліць несудзілася. Але вядома, што 4 красавіка 1943 г. германская амбасада пры Ватыкане афіцыйна зьвярнулася да папскага Дзяржаўнага сакратарыята з патрабаваньнем даць растлумачэньні зь нагоды атрыманай СД сакрэтнай інфармацыі аб тым, што кардынала Сьпелмана чакаюць у Маскве для падрыхтоўкі канчатковай дамовы паміж Ватыканам і СССР[192].

Узгаданы вышэй факт робіць цалкам зразумелым выслаў "шэфа менскага СД Эдварда Штраўха, якія ён сказаў 10 красавіка 1943 г., выгалошваючы даклад на нарадзе гэбітскамісараўі начальнікаў аддзелаў генеральнага камісарыяту акупацыйнай акругіБеларусь" : "Без сумніву – Царква гэта наш вораг. Натуральна, Царква хоча папоўніць тутсвае страты, якія яна зазнала ў Эўропе, а асабліва ў Райху. Яна мела намер гэта зрабіць праз пранікненьне да праваслаўнае Царквы, акольным шляхам праз Уніяцкую Царкву [...]. Умовы для яе былі спрыяльныя, і Рыма-каталіцкая Царква прыйшла сюды зь вялікай колькасьцю прапаведнікаў і не сустрэла вялікіх цяжкасьцяў [...]. Таму аднадушна мы вырашылі спыніць тут гэтую Рыма-каталіцкую Царкву [...]. Паколькі большасьць духавенства прыняло бок алякаў, мне удалося іх злавіць і скончыць з імі"[193]

Супастаўляючы час перамоваў СССР і Ватыкану ў 1942 г., а таксама дзьве даты (зварот нямецкага абмасадара да Дзяржсакрата Ватыкана і выступ Эдварда Штраўха ў Менску) зразумела ўся недарэчнасьць і надуманасць спробы а.дыякана Я. Усошына і а.архімандрыта Сяргея (Гаека) абгрунтаваць словамі Штрауха арышт а.Неманцэвіча за "дзейнасьць у якасьці каталіцкага пастыра"[194]. Тут відавочна бачна спроба кіраўніка СД павязаць беларускага грэка-

[191] Тамсама. б. 39-40
[192] Тамсама, б. 75.
[193] Дыякан Яўген Усошын, архімандрыт Сяргей Гаек. Экзах Антон Неманцэвіч верны сьведка Евангельля. // ROCZNIKI TEOLOGICZNE. Tom LIII-LIV, zeszyt 7 – 2006-2007. б. 160-161
[194] Тамасама. б. 160



каталіцкага экзарха (магчыма – экзархат цалкам) з прапольскай і, галоўнае, анцінямецкай дзейнасьцю адміністрацыі Рыма-Каталіцкага Касьцёлу ў Беларусі (узгадаем аб вэрсіі магчымага ўдзелу ў польскам анцінямецкам руху а.Гермацюка і падцьверджанай польскім кардыналам супрацы мітр. Шэптыцкага з польскай каталіцкай кансьпірацыяй і АК), альбо – бачаньня ў а.Неманцэвічы праваднікa анцінямецкай і прапольскае палітыкі Ватыкану сярод беларускага насельніцтва.


*Папа Пій XII*

Немцы цалкам маглі аб'яднаць у адну справу арганізацыю беларускага нацыянальнага (анцінямецкага) супраціву кс.В. Гадлеўскім, паездку а.Неманцэвіча ў Львоў і перамовы Ватыкана зь Масквой.

Аб палітычных, а не рэлігіных падставах арышту не толькі а.А. Неманцэвіча, а наогул шэрагу каталіцкіх ксяндзоў на тэрыторыі Беларусі ў 1942 – 1943 г.г. піша ў сваім дасьледваньні і беларускі гісторык А. Гардзіенка: "Генэральны камісар Беларусі Вільгельм Кубэ ў сваёй палітыцы рабіў стаўку на беларускі нацыяналізм, таму і Касьцёл не застаўся па-за ягонай увагай. Са свайго боку захады па аднаўленьні дзейнасьці Касьцёлу на Беларусі рабіў і Віленскі арцыбіскуп Рамуальд Яблжыкоўскі. 13 кастрычніка 1941 г. ён быў прызначаны Апостальскім адміністратарам для Менскай і Магілёўскай дыяцэзіяў зь надзвычайнымі паўнамоцтвамі (прызначэньне Ватыкана). Сваёй уладай ён прызначаў ксяндзоў у былыя парафіі гэтых дыяцэзіяў. Пры гэтым, калі Генэральны камісар прытрымліваўся прабеларускай палітыкі, то Апостальскі адміністратар адстойваў інтарэсы палякаў."[195]

Аб гатоўнасьці Пія XII весьці ўласную (рыма-каталіцкую) празэлітыйскую гульню ў СССР (пасьля перамогі Сталіна над Гітлерам або нават на вызваленых ад нямецкае акупацыі тэрыторыях) ужо ад 1942 г. сьведчыць і выдадзены ў Рыме "Ordo mesae. Чинъ мессы"[196]

[195] Алег Гардзіенка. Рэлігійная апазыцыя савецкай уладзе (1944-1953 гг.) // http://represii-by.info/index.php?newsid=474
[196] Ordo mesae. Чинъ мессы. Roma-Рим, 1942 г.



# Ordo Missæ

Sacerdos paratus cum ingreditur ad Altare, facta illi debita reverentia, signat se signo crucis a fronte ad pectus, et clara voce dicit:

† In nómine Patris, et Fílii, et Spíritus Sancti. Amen.

Deinde, iunctis manibus ante pectus, incipit antiphonam:

Introíbo ad altáre Dei.

Ministri respondent:

Ad Deum qui lætíficat juventútem meam.

Postea, alternatim cum Ministris dicit sequentem Ps. 42.

Júdica me, Deus, et discérne causam meam de gente non sancta: ab hómine iníquo, et dolóso érue me.

M. Quia tu es, Deus, fortitúdo mea: quare me repulísti, et quare tristis incédo, dum afflígit me inimícus?

S. Emítte lucem tuam, et veritátem tuam: ipsa me deduxérunt, et adduxérunt in montem sanctum tuum, et in tabernácula tua.

M. Et introíbo ad altáre Dei: ad Deum qui lætíficat juventútem meam.

S. Confitébor tibi in cíthara, Deus, Deus meus: quare tristis es, ánima mea, et quare contúrbas me?

M. Spera in Deo, quóniam adhuc confitébor illi: salutáre vultus mei, et Deus meus.

S. Glória Patri, et Fílio, et Spirítui Sancto.

M. Sicut erat in princípio et nunc, et semper, et in sæcula sæculórum. Amen.

Sacerdos repetit antiphonam:

Introíbo ad altáre Dei.

R. Ad Deum qui lætíficat juventútem meam.

Signat se, dicens:

V. Adjutórum nostrum in nómine Dómini.

R. Qui fecit cælum et terram.

Deinde iunctis manibus profunde inclinatus facit confessionem.

# Чинъ Миссы

Іерей приступаетъ къ олтарю, преклоньса предъ нимъ, знаменуетъ са крестнымъ знаменіемъ ѿ чела къ персемъ, и ясными гласомъ речетъ:

† Во имя Отца, и Сына, и Святагѡ Духа, аминь.

По томъ стиснувъ руцѣ предъ перси, почнетъ припѣвъ:

Вниду къ олтарю Божію.

Слузѣ ѿвѣщаютъ:

Къ Богу веселящему юность мою.

Паки на премѣну со слугама глаголетъ следующій Ѱаломъ мв.

Суди ми, Боже, и разсуди прю мою ѿ языка не преподобна: ѿ человѣка неправедна и льстива избави мя.

Сл. Яко ты еси, Боже, крѣпость моя, вскую ѿринулъ мя еси; и вскую сѣтуя хожду, внегда стужаетъ ми врагъ;

Іер. Посли свѣтъ твой и истину твою: та мя настависта, и введоста въ гору святую твою и въ селенія твоя.

Сл. И вниду къ олтарю Божію, къ Богу веселящему юность мою.

Іер. Исповѣмся тебѣ въ гуслехъ, Боже, Боже мой: вскую прискорбна еси, душе моя; и вскую смущаеши мя;

Сл. Уповай на Бога, яко еще исповѣмся ему, спасеніе лица моегѡ и Богъ мой.

Іер. Слава Отцу, и Сыну, и Святому Духу.

Сл. Якоже бѣ искони, и нынѣ и присно, и во вѣки вѣкѡвъ, аминь.

Іерей повторяетъ припѣвъ:

Вниду къ олтарю Божію.

Сл. Къ Богу веселящему юность мою.

Знаменуетъ са глаголя:

Іер. Помощь наша во имя Господа.

Ѿ. Сотворшагѡ небо и землю.

По томъ стиснувъ руцѣ, преклоньса низко, дѣетъ исповѣдь.

3

*Першая старонка “Ordo mesae. Чинъ мессы”. Копія зь украінскага перавыданьня 2002 г. На апошняй старонцы надпіс: “Репринтне видання: Рим - 1942 р.” Таксама як і ў рымскіх грэка-каталіцкіх выданьнях выкарыстоўваецца расейская вымова царкоўна-славянскай мовы.*



з паралельным тэкстам на лацінскай і царкоўна-славянскай мове. Улічвая, што да II Ватыканскага сабору імша праходзіла толькі на лацінскай мове, бязспрэчны факт яе прызначэньня найперш для праваслаўных тэрыторый у СССР. (Сёньня гэта рарытэтнае выданьня магчыма знайсьці ў некалькіх бібліятэках Украіны і Расейскай Фэдэрацыі. Яно (выданьне) таксама ў 2002 г. перавыдадзена каталікамі-лефаварыстамі на Ўкраіне.)

Дарэчы, спадзяваньні Ватыкана на тое, што Сталін дазволіць весьці рыма-каталіцую працу ў Заходніх раёнах СССР (Беларусі, Украіне, Прыбалтыцы) пасьля іх вызваленьня ад немцаў былі не беспадставаўнымі. Пасьля перамоваў Сталіна з рыма-каталіцкім сьвятаром Станіславам Арлеманскім (28 красавіка 1944 г.), было дазволена польскім дзецям атрымоўваць урокі  Закона Божага  у каталіцкіх сьвятароў. На сродкі ўрада была аддрукаваная партыя Біблій і каталіцкіх малітоўнікаў, а ў Заходняй Украіне, Беларусі і Прыбалтыцы былі ізноў адчыненыя цэрквы для вернікаў лацінскага абраду.

У новых ватыканскіх нэапразэлітыскіх плянах Беларусь мусіла займаць асобнае месца, бо зь усіх славянскіх краінаў толькі тут рыма-каталіцтва не зьяўлялася жорсткай адзнакай пэўнай нацыянальнай прыналежнасьці. Адначасна, РКЦ мела тут досыць вялікую колькасьць вернікаў і старажытныя традыцыі. Зь агляду на гэта, дзейнасьць Беларускага грэка-каталіцкага экзархату была абсалютова не на карысьць Ватыкану, бо яшчэ міжваеная практыка паказала: Беларуская грэка-каталіцкая (уніяцкая) Царква фармуюць сваю паству ня столькі працай сярод праваслаўнага насельніцтва, а колькі пераводам на ўнію рыма-каталікоў – нашчадкаў уніятаў.

Аднак летам 1942 г. становішча на савецка-гэрманскам фронце было яўна не на карысьць СССР. У падобных умовах, Ватыкан, спрабаваўшы ў той час падыгрываць усім разам — Вашынгтону, Берліну і Маскве адначасова, а ў момант актывізацыі і пасьпяховасьці перамоваў зь СССР вясной-восеньню 1942 г., цалкам мог пайсьці на “здачу”(як мінімум – маўчалівы дазвол на арышт экзарха і ліквідацыю экзархату) занадта актыўнага і нацыянальна сьвядомага беларускага грэка-каталіцкага экзарха. Да таго ж разьвяртаньня і спрыяньне дзейнасьці новай грэка-каталіцкай структуры на акупаванай “тэрыторыі СССР” цалкам магло перашкодзіць пасьпяховасьці перамоваў зь савецкім кіраўніцтвам. Таму  “здаваючы” беларускі грэка-каталіцкі  экзархат,  ватыканская дыпляматыя адначасна выяўляла ляяльнасьць:

– Маскве, справай выяўляючы гатоўнасьць да ліквідацыі грэка-каталіцкіх структураў у СССР;

– Бэрліну – здаючы “анцінямецкі кансьпірацыйны цэнтр “няпаўнавартасных каталікоў””.

Магчыма менавіта таму быў ня толькі арыштаваны экзарх а. Антоні Неманцэвіч, а і праведзена нягласная ліквідацыя структуры Беларускага грэка-каталіцкага экзархату (аніякіх дакумэнтаў аб ліквідацыі экзархату альбо абмежываньні дзейнасьці уніяцкіх сьвятароў у Беларусі немцы не выдавалі)

Тут варта ўзгадаць той факт, што ні растрэл немцамі кс. Гадлеўскага, ні растрэлы асобных ксяндзоў і клірыкаў Рыма-каталіцкай Царквы ў Беларусі, не прывялі да ліквідацыі немцамі (афіцыйна або прыхавана) яе царкоўных структураў. Падобнае назіраецца ў 1943-1944 г.г. у Беларусі і на Валыні, калі арышты зьвязаных зь нацыянальнай партызанкай (украінскай, польскай, беларускай, савецкай) сьвятароў не прывялі да ліківодацыі ўласна БАПЦ, ЎАПЦ, УГКЦ і РКЦ, альбо іх структураў у пэўных раёнах. Пры гэтым, зь агляду на жорсткую акупацыйную палітыку нямецкіх уладаў, колькасны склад парахфій меў другашэраговае значаньня.

Калі браць пад увагу “ватыканскі” фактар, а пакідаць яго паза ўвагай мы ня маем права, магчыма зрабіць высновак аб тым, што а.Неманцэвіч, на той час знакавая асоба ў гіярархіі Каталіцкай Царквы, магчыма быў пэўным закладнікам немцаў у гульнях зь ватыканам. Невыпадкова обершумбанфюрэр СС Штраўх, давая справаздачу аб арышце і сьмерці а. Неманцэвіча, адзначае: “Маючы на ўвазе значэньне яго пэрсоны, яго даставілі ў штабкватэру паліцыі бясьпекі і СД Беларусі”[197]. Верагодней за ўсё, а.Неманцэвіча шмат дапытвалі зь ужываньнем катаваньняў – тут аўтары ўзгаданага вышэй артыкулу, а.дыякан Я. Усошын і а.архімандрыт Сяргей (Гаек), маюць рацыю. Якія сьведчаньня немцы чакалі атрымаць ад экзарха? Пагадзіцеся, не рэлігійна-багаслоўскія пытаньні цікавілі кіраўніка службы СД.

Хутка высьветліўшы, што ён ня мае аніякага асаблівага дачыненьня да анцінямецкае кансьпірацыі (аб пэўных падзеях і людзях экзарх прамаўчаў, за што заслугоўвае асобнае павагі) немцы працягвалі трымаць яго пад вартай. У гэтым выпадку забойства экзарха немцы маглі зьдзясьніць: альбо як акт устрашэньня каталіцкага кліру; альбо – з часама палічыўшы экзарха няпатрэбным і нецікавым у палітычнай гульне[198].

[197] Нацыянальны архіў РБ, ф.370, ап. 1, справа 2, арк. 5



**У сувязі з “ватыканскай” вэрсіяй арышту а. А. Неманцэвіча (чамусьці цалкам ігнараванай сучаснымі беларускімі грэка-каталіцкімі дасьледчыкамі) застаецца адчыненай дата і месца ягонай сьмерці.**

Так, калі абапірацца на даведку обершумбанфюрэра СС Штраўха, знойдзеную ў беларускім архіве, а. Антоні Неманцэвіч памёр 6 студзеня 1943 г. “ад сярдэчна-сасудзістай недастатковасьці, надышоўшай ад сыпнога тыфу”. Падобную вэрсію, як я ўжо адзначаў вышэй, немцы паўтарылі ў 1944 г. біскупу Гэнрыху Вінкену. Але тут цяжка не пагадзіцца зь а. Львом Гарошка, які падкрэслівае, што экзарх тыфам ужо хварэў і падобным сьцьверджаньнем немцы спрабавалі прыхаваць забойства, альбо – сьмерць ад катаваньняў.

Паўстае пытаньня: калі немцы маглі схлусіць у адным, чаму яны не хлусілі і ў іншым? Да таго ж вялікі сумнеў закладае сьцьверджаньня а.дыякана Я. Усошына і а. архімандрыта Сяргея (Гаека) аб тым, што а. Антоні Неманцэвіч “быў пахаваны 9.01.1943 г. … сьвятаром мясцовай праваслаўнай царквы”[199] Няўжо немцы ***тры дні захоўвалі мёртвае цела сьвятара?!*** Ды і праваслаўных сьвятароў у Менску было досыць мала і ўсе яны “замыкаліся” на беларускам актыве і канцэлярыі БАПЦ. Калі б факт пахаваньня экзарха было праўдай, ён нямінуча зрабіўся б вядомым герархіі БАПЦ і (альбо) беларускаму актыву і, праз іх, паваенай беларускай эміграцыі. Бо а. архімадрыту Сяргею (Гаеку) мусіць быць вядомым – сьвятар складае справаздачу аб усіх зьдзясьнёных пахаваньнях правячаму япархіяльнаму архірэю (асабліва ў такім выключным і сур’ёзным выпадку). У дадзеным вы-

[198] На мой погляд, а. Неманцэвіч аніякім чынам ня быў прычэтны да палітычных кантактаў Ватыкана ў 1942 г. Бо на тэрыторыі Беларусі на той час ня быў прысутны ніводны з рыма-каталіцкіх герархаў (найбліжчыя з іх знаходзіліся ў Коўна і Варшаве), але дакумэнтаў альбо сьведчаньняў аб кантактах экзарха зь Варшавай і (альбо) Коўна няма. Магчыма нешта ведалі ў Львове, але і там сувязі з Рымам былі эпізадычныя. Таму разглядаць а.Неманцэвіча, нават гэпатэтычна, як удзельніка перамоўнага працэсу Ватыкана і СССР нямагчыма, але немцы маглі прытрымлівацца іншага погляду альбо – мець, да сёньня невядомыя, сьведчаньні і (альбо) дакумэнты.

[199] Дыякан Яўген Усошын, архімандрыт Сяргей Гаек. Экзах Антон Неманцэвіч верны сьведка Евангельля. // ROCZNIKI TEOLOGICZNE. Tom LIII-LIV, zeszyt 7 – 2006-2007. б. 161

падку – архіяпіскапу Філафею (Нарко). Апошні шчасьліва выйхаў на эміграцыю і шмат год падтрымліваў добрыя адносіны з Дз. Касмовічам, адным зь выбітных дзеячаў беларускай палітычнае эміграцыі. Ці быў нейкі сэнс архіяпіскапу ўжо пасьля вайны ўтаямнічваць факт сьмерці і пахаваньня беларускага грэка-каталіцкага экзарха А. Неманцэвіча?

Мне падаецца цалкам лягічным і магчымым вываз грэка-каталіцкага экзарха ў Бэрлін і спроба нямецкіх сьпецслужбаў выкарыстаць досыць высокага каталіцкага герарха ва ўласных палітычных гульнях. Калі патрэба ў ім "адпала", немцы бязлітасна забілі сьвятара. Тым больш, што пакуль не знойдзены пратаколы допытаў а. Неманцэвіча ў Менскай турме. А вось пэўныя ўскосныя доказы меркаваньня аб вывазу экзарха Неманцэвіча ў Бэрлін восьньню 1942 г. прыводзіць а.Леў Гарошка.

Так, у сваёй публікацыі "Айцец Антон Неманцэвіч. Першы Беларускі Экзарх", а.Гарошка піша: "Айца Неманцэвіча немцы прывязьлі ў Слонім, а адтуль таго-ж самага дня ў Баранавічы дзесьці каля абеду. Адзін зь нашых працаўнікоў, які працаваў у баранавіцкім СД, быў сьведкай перавозу а. Неманцэвіча. Ён апавядае, што а. Антон быў моцна перапалоханы сваім арыштам, ды прасіў яго: "браточкі, ратуйце", "што яны хочуць ад мяне?". Гэны супрацоўнік зараз зьвярнуўся да начальніка СД, пытаючыся, за што арыштованы Беларускі Экзарх? Яму адказалі, што яны арыштавалі яго на загад зь Менску і зараз яго туды адсылаюць, а самі нічога ня маюць супроць яго. Пацяшалі гэнага супрацоўніка, што, магчыма, нічога такога няма і экзарха хутка выпусьцяць. Зрэштай ён "не арыштованы", казалі, але вязецца ў Менск пад нямецкай "аховай" дзеля бясьпекі экзарха. Усё гэта перадаў гэны супрацоўнік СД айцу Неманцэвічу. Хутка пасьля гэтага канвой зь а. Неманцэвічам ад'ехаў у Менск. У Менску а. Неманцэвіч быў зьняволены ў падвалах менскага СД прыблізна да канца верас[ьня]. Праз гэты час праводзіліся допыты яго ды чакалася на пастанову з Бэрліна"[200]

Вышэй выкладзеная цытата зьбягаецца і зь наступным сьведчаньнем а.Льва Гарошка: "і ў Менску ён заставаўся нядоўга, бо толькі адзін раз у турме ўзялі пасылку на яго імя."[201]

[200] а. Льва Гарошкі "Айцец Антон Неманцэвіч. Першы Беларускі Экзарх". // Беларуская Царква. № 27, 1964 г. б.33-34



Такім чынам, паводле а.Льва Гарошка, у Менску экзарха Неманцэвіча немцы трымалі толькі да канца верасьня 1942 г. А што было пасьля верасьня?

Па майму меркаваньню, цалкам магчыма, што ў сувязі з першай інфармацыяй аб перамовах Ватыкана і Масквы (канец жніўня 1942 г.), экзарха вывязлі ў Бэрлін і трымалі ў тамтэйшай турме. Бо ў трымаць яго больш трох месяцаў тамена ў Менскай турме, у абслузе якой было шмат беларусаў, практчна немагчыма.

Зь агляду на ўзгаданыя вышэй факты і даты, заслугоўвае ўвагі вэрсія беларускага дасьледчыка Ю. Гарбінскага аб тым, што "паводле апошніх польскіх публікацый і выданьняў…" а. Антоні Неманцэвіч загінуў у Бэрлінскай турме 1 красавіка 1943 г. [202]

Як бачым, і "ватыканскі" сьлед арышту і гібелі а. Неманцэвіча мае палітычны падмурак.

**Цікавым ёсьць і факт "таямнічай" карэкцыі вэрсіі падставы гібелі А. Неманцэвіча ў дзьвух працах а. Льва Гарошка і В. Пануцэвіча, а таксама балючая рэакцыя сучаснага беларускага грэка-каталіцкага кліру на зьяўленьня ў друку фактаў супрацы беларускага экзарха з БНП. І тут на дапамогу прыйшла гістарычная храналёгія.**

Успаміны а.Л. Гарошкі аб а. А. Неманцэвічы ў часопісе "Беларуская Царква" і артыкул В. Пануцэвіча "Кс. Вінцэсь Гадлеўскі. Дзяржаўны Муж і Правадыр Народу", пабачылі сьвет падчас правядзеньня II Ватыканскага Сабору (1962 – 1965 г.г.), на якім прысутнічаў вядомы дзеяч УГКЦ і спадкаемец справаў мітрапаліта А. Шэптыцкага патрыярх І. Сьліпы. Апошняга камуністы вызвалілі зь савецкага лягеру і выслалі на Захад па асабістай дамоўленасьці прэзыдэнта ЗША і кіраўніцтва СССР на пачатку 1963 г.[203] Менавіта падчас сабору, патрыярх І. Сьліпы дамагаецца ад Папы дабраслаўленьня на пачатак беніфікацыйных справаў "новамучанікаў УГКЦ", у тым ліку, цалкам магчыма, і а. А. Неманцэвіча. Дзеля беніфікацыі патрэбна мучаніцтва менавіта за веру, іншыя падставы

[201] а. Л. Гарошка. Айцец Антон Неманцэвіч. // Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.348

[202] Жыццярысы. Антоній Неманцэвіч. // Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б.133.

[203] Рудницький Л. Твердий і незламний був його дух. // Патріярхат № 5 (372) вересень-жовтень 2002. б.12.

пазбаўляюць права на беніфікацыю па факце мучаніцтва.

Да таго ж, кіраўнікі БНП і пераважная большасьць яе сяброў пэўны час "засьвяцілася" на службе ў акупацыйных і вайскова-паліцэйскіх фармацыях Няметчыны ў 1941 – 1945 г.г. А Ватыкан, як мы ўжо казалі вышэй, спрабаваў усяляк адмяжавацца ад супрацы зь Няметчынай. Ягоным палітыкам былі абсалютова абыякавы ўмовы дзейнасьці беларускага вызваленчага руху (Беларускага супраціву) у часе II Сусьветнай вайны. Тут беларускія дзеячы былі не паадзінокі: У тую ж пастку патрапілі і ўкраінцы, калі яшчэ ў пачатку 50-х гадоў спрабавалі распачаць працэс па беніфікацыі мітрапаліта А. Шэптыцкага. Па сьведчаньню шэрагу ўкраінскіх навукоўцаў, галёўнай перапонай працэсу кананізацыі мітрапаліта ёсьць ягонае прыхільнае стаўленьня і пастырская апека над украінскімі батальёнамі "Нахцігаль" і "Роланд", украінскае дывізіі СС "Галіцыя". Далёка не адназначнай была і ацэнка клірыкамі РКЦ, найперш з польскае эміграцыі, дзейнасьці ЎПА. Таму факт падтрымкі ўкраінскага вызваленчага руху пераважыў усе рэлігійныя заслугі мітрапаліта А. Шэптыцкага прад Ватыканам.

Архімандрыт Л. Гарошка выдатна ведаў патрыярха І. Сьліпога яшчэ з часоў свайго навучаньня ў Львоўскай Богаслаўскай Акадэміі і, хутчэй за ўсё, бачыўся зь ім па ягоным прыезьдзе ў Рым. Таму верагодна, што далейшыя карэктывы біяграфіі ды падставаў сьмерці экзарха А.Неманцэвіча ёсьць вынікам пэўных дамоўленасьцяў.

Цалкам магчыма, што зьмена поглядаў а.Льва Гарошка на падставы арышту і забойства Беларускага грэка-каталіцкага экзарха, адбыўшася пад ціскам украінцаў, абумоўлена наяўнасьцю пэўнга "нацыянальнага кампрамату" на а.Льва. Так, у архівах Польшчы захоўваюцца сьведчаньні аб актыўнай украінізатарскай дзейнасьці а.Гарошка на Беларускам Палесьсі ў міжваенны пэрыяд: "У в. Гарадна сьвятар усходняга абраду Леў Гарошка, разам з дьякам украінцам Максімам Яструбецкім … праводзілі сярод агулам спакойнага народу яўную палітычную агітацыю … вучылі моладзь украінскім сьпевам, чытаць і пісаць па-украінскі, намагаючыся на кожным кроку абуджываць актыўны ўкраінскі нацыяналізм."[204] Агучваньне падобнай дзейнасьці магло вельмі негатыўна адбіцца на беларускам нацыянальным іміджы а.Льва.

В. Пануцэвіч аб магчымых дамоўленасьцях усходне-каталіцкіх клірыкаў а. архімандрыта Л. Гарошкі і патрыярха І. Сьляпога, хутчэй за ўсё, у 1964 – 1965 г. яшчэ ня ведаў, бо зьяўляўся сьвецкай асобай і жыў на той час ужо ў ЗША. Ці даведаўся ён аб іх пазьней? Верагодней усяго так, бо мы больш не знаходзім публікацыяў аб зьвязцы палітычнае дзейнасьці В. Гадлеўскага і лёсу Белаурскага грэка-каталіцкага экзарха А. Неманцэвіча. Але, разам з тым, не друкуе ён і матар'ялаў якія б аспрэчылі раней-шую інфармацыю (праца "Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква" засталася ў рукапісах, надрукавана пасьля сьмерці аўтара, рэдагавалася прад друкам іншымі асобамі, а час яе напісаньня не датаваны).

---

[204] Справаздача "Рэлігійнае становішча ў Палесскам ваяводцтве на 1939 г." // Берасьцейскі вобласны архіў, ф. 1, ап. 2, сп. 2019, б. 5-6



Падобнымі, палітыка-рэлігійнымі, падставамі тлумачацца і шматлікія спробы каталіцкіх дасьледчыкаў ускласьці адказнасьць за сьмерць грэка-каталіцкага экзарха а.А.Неманцэвіча на "беларускіх аўтакефалістаў".

Так, чытаючы гістарычныя матар'ялы і лістуючыся з паваеннай беларускай эміграцыяй, магчыма бачыць наступнае: БАПЦ, негледзячы на шматлікія закалоты, падзелы і г.д., здолела згуртаваць вакол сябе пераважную большасьць беларускай дыяспары на ўсіх кантынентах. Праваслаўныя парахфіі захаваліся і дзейнічаюць практычна ва ўсіх дыяспаральных асяродках. І гэта пры тым, што аніякай зьнешняй матэрыяльнае падтрымкі беларускія праваслаўныя асяродкі не мелі, усю працу праводзілі за асабістыя грошы.

А вось грэка-каталіцкі клір так і не здолеў шырака разгарнуць сваю дзейнасьць на Захадзе, хаця быў больш згуртаваны і меў магчымасьць карыстацца рэсурсамі Ватыкану. Да пачатку 80-х гадоў дзеючая беларуская ўніяцкая парахфія існавала толькі ў Лёндане. Менавіта з апошняга факту, на мой погляд, вынікае жаданьне некаторых асобаў перакласьці на праваслаўны беларускі рух цягар віны ў сьмеці а.А. Неманцэвіча і гэтым пэўным чынам дыскрыдытаваць ідэю беларускай праваслаўнай аўтакефаліі ў вачах сьвядомых беларусаў.

**Апошняя таямніца – царкоўна-кананічны (прававы) лёс уласна самога Беларускага грэка-каталіцкага экзархату.**

Калі ліст Ватыкану аб дабраслаўленьні дзеяў мітрапаліта А.Шэптыцкага па арганізацыі экзархатаў і прызначэньні экзархаў шырока ўзгадваецца і цытуецца ў сучаснай гістарычна-рэлігійнай літаратуры, то аб далейшым лёсе экзархатаў як царкоўна-кананічных адзінак не паведамляецца. Таксама няма аб іх інфармацыі на афіцыйнымі сайце Ватыкану, але а.Леў Гарошка ў паваены час

ніколі не прадстаўляўся “намесьнікам экзарха.”[205]

Існуе непадцьверджаная гіпотэза, што менавіта пытаньня Беларускага грэка-каталіцкага экзархату было падставай шматлікіх адмоваў а. В. Аношка выйхаць з ПНР на Захад у канцы 40-х – пачатку 60-х гадоў ХХ ст. Бо аб тым, што ён усёй душой імкнуўся выехаць з Польшчы піша ў некралёгу а. Язэп Гэрмановіч[206].

Нажаль, выкрыць апошнюю таямніцу здольная толькі сама Каталіцкая Царква вуснамі сваіх гіерархаў…

Выкладзеныя вышэй факты ніякім чынам не можуць запярэчваць гістарычнайсьць постаці а.экзарха Антонія Неманцэвіча, ягоную мужнасьць і адданасьць Царкве і Бацькаўшчыне, існаваньне ў Беларусі грэка-каталіцкіх вернікаў, сьвятое права гэтых людзей мець уласную Царкву.

---

[205] а. Вацлаў Аношка ня мог гэтага рабіць , бо знаходзіўся ў “краіне сацлягеру” – ПНР

[206] Мае прыяцелі – В. Аношка. // Беларускія рэлігійныя дзеячы ХХ стагоддзя. Мінск – Мюнхен, 1999. б. 266